ШТО ШУКАЮЦЬ НА ВОСТРАВЕ КЛЯШТАР?

5



ПАКЛАПАЦІЦЦА, КАБ ЖЫЦЬ ПРЫГОЖА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 ЛІПЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 139 (29006)

9-24 стар.
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Артур КАРПОВІЧ, першы намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю:

«У Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю спецыяльна створанай групай падрыхтаваны праект указа кіраўніка дзяржавы, які прадугледжвае карэкціроўку Указа № 345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання». Сярод асноўных новаўвядзенняў — падаўжэнне да канца 2030 года перыяду прадстаўлення льгот і прэферэнцый. Таксама праект дакумента прадугледжвае ўсталяванне асобнага ільготнага тарыфу на электраэнергію для рознічных гандлёвых аб'ектаў, аб'ектаў грамадскага харчавання, размешчаных на вёсцы».

«ТУТ ЖЫЦЬ МОЖНА, ТУТ ЖЫЦЬ ТРЭБА»

Учора Аляксандр Лукашэнка здзейсніў візіт на Гомельшчыну, які анансаваў на нядаўняй селектарнай нарадзе па ходзе ўборачнай кампаніі

Паўднёва-ўсходні рэгіён падчас дыстанцыйнай гутаркі з губернатарамі выклікаў заклапочанасць у кіраўніка дзяржавы: тут асабліва не пашанцавала з надвор'ем. З'явіліся ў Прэзідэнта пытанні і па структуры пасеваў, а таксама па кадравай палітыцы.

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка абраў для візіту Веткаўскі раён — адну з самых самабытных і прыгожых мясцін Беларусі, якая, на жаль, пацярпела ад чарнобыльскай аварыі.

Былі ўзнятыя многія праблемныя пытанні, але, напэўна, галоўным вынікам візіту стала кароткая сустрэча Прэзідэнта з жыхарамі райцэнтра, якія сардэчна падзякавалі за ўвагу кіраўніцтва краіны да сябе.

«Вы мне не дзякуйце, гэта я вам павінен падзякаваць за тое, што вы гадоў дваццаць-трыццаць таму паверылі мне і тут засталіся! — сказаў ён людзям. — Вы памятаеце, якая была сітуацыя ў Веткаўскім раёне?.. Я вам удзячны за тое, што вы заўсёды мяне падтрымлівалі. А сёння мы бачым, што тут жыць можна, што тут жыць трэба, як бы ні было цяжка, бо на чужыне вам лягчэй не будзе».

СТАР. 2

КАРАТКА

- У Гродзенскай вобласці звыш 40 экіпажаў камбайнераў намалацілі па тысячы і больш тон збожжа.
- **Дні культуры Егіпта пройдуць восенню ў Беларусі.**
- Беларусь падчас II Еўрапейскіх гульняў наведала, паводле папярэдніх падлікаў, каля 37,5 тысячы турыстаў.

- **У Баранавіцкім раёне работнікі выратавалі пры пажары 25 цялят.**

Дэмаграфія

КАБ БЕЛАРУСАЎ НЕ МЕНШАЛА...

У нашай краіне пачынае зніжацца нараджальнасць, у той час як узровень смяротнасці застаецца стабільна высокі. Усё гэта — сведчанне неспрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыі. Што думае рабіць дзяржава, каб колькасць беларусаў не памяншалася?

Фота БелТА.

Вырашэнне пытання з жыллём

«Сем'і ўсё часцей адкладаюць нараджэнне дзяцей на пазнейшы тэрмін», — кажа **кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЕЛАШ.** Маладыя людзі імкнуцца спачатку зрабіць кар'еру, дасягнуць матэрыяльнага дабрабыту і не спяшаюцца ствараць сям'ю. А калі і ствараюць, то часцей за ўсё не заключаюць афіцыйны шлюб, што таксама не спрыяе нараджальнасці. Але асноўная прычына, з якой сем'і адкладаюць нараджэнне дзяцей альбо прыняцце рашэння аб павелічэнні складу сям'і, паводле слоў спецыяліста, — жыллёвае пытанне.

СТАР. 4

Камунальныя стасункі

РЫХТУЙ ЦЕПЛАТРАСЫ ЛЕТАМ

Чым займаюцца сёння камунальшчыкі і энергетыкі

Планавыя адключэнні вады, рамонт цепла- і электрасетак, замена газавых прыбораў і стратэгічны запас паліва. Пра гэтыя і іншыя моманты падрыхтоўкі да ацяпляльнага сезона расказалі спецыялісты ЖКГ, энергетыкі і газавай галіны.

ЦЕПЛАВЫЯ КІЛАМЕТРЫ

Штогадовая замена старых цепласетак ПІ-трубамі дазваляе не толькі зменшыць цепластраты і павысіць надзейнасць цеплазабеспячэння спажыўцоў, але і скараціць тэрміны планавых адключэнняў гарачай вады для рамонтных работ. У Ваўкавыску, напрыклад, гарачую ваду адключаюць у сяроднім на 10 сутак, у Навагрудку — на тыдзень, а ў раёнах Слоніма, якія абслугоўваюцца жыллёва-камунальнымі службамі, — увогуле на 3-4 дні, падкрэсліў **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, начальнік упраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і СМІ Міністэрства ЖКГ:**

— Прыярытэтныя кірункі ў падрыхтоўцы да ацяпляльнага сезона — іспыты, рэканструкцыя і рамонт цеплавых, водаправодных і каналізацыйных сетак, а таксама кацельнага абсталявання і жыллёвага фонду. Усе рэгламентныя работы скіраваны на павышэнне якасці паслуг па ацяпленні і гарачым водазабеспячэнні.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

«ТУТ ЖЫЦЬ МОЖНА, ТУТ ЖЫЦЬ ТРЭБА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аб сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна кіраўніку дзяржавы далажыў першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзь Салавей. Ён прызнаўся, што адна з галін, якая найбольш адстае на сённяшні дзень, — сельская гаспадарка. Тэмпы развіцця будаўніцтва, прамысловасці неблагія, нягледзячы на страты нафтаправода «Дружба» з-за забруджанай расійскай нафты.

«Пытанне, якое нас сёння найбольш хвалюе ў прамысловасці, — «Гомсельмаш», — сказаў кіраўнік вобласці. — І мы разглядаем розныя канцэпцыі: развіццё збожжаўборачнай вытворчасці, кармаўборачнай вытворчасці і вытворчасць камбайнаў для ўборкі буракоў з лакалізацыяй 50 %».

У вобласці невялікія запасы гатовай прадукцыі, выконваюцца паказчыкі па экспарце, развіваецца турызм.

Найбольш развітая галіна — будаўніцтва. За паўгода Гомельшчына пабудавала трохі больш за палову запланаванага гадавога аб'ёму жылля. «Працуем у рамках 240-га Указа — мы цудоўна разумеем, што павінны ўсіх шматдзетных забяспечыць жыллём, — дадаў Генадзь Салавей. — Сёлета плануем забяспечыць 2000 сем'яў з 5800».

На гэта кіраўнік дзяржавы заўважыў: «Глядзіце, каб вы шматдзетныя сем'і, якія фактычна фінансуюцца з бюджэту, не сцягнулі ў Гомель. Ні ў якім разе! Гэта няправільна будзе. Шматдзетная сям'я павінна жыць у невялікім горадзе, а лепш за ўсё — у аграгарадку. Гэта і нам патрэбна — дзяржаве, і дзецям выгадна».

Ён прывёў у прыклад дом, пабудаваны для 10 шматдзетных сем'яў у Мінскай вобласці. «Задаволеныя ўсе людзі, прыехалі з буйных гарадоў і з задавальненнем там жывуць, — расказаў Прэзідэнт. — У нас аграгарадку ўжо ў больш-менш нармальным стане, чаму там не жыць? Гэта будзе спрыяць размеркаванню рабочай сілы. Усё ж такі ў гэтых сем'ях па трое-пяцёра дзяцей».

Датычна «Гомсельмаша» Аляксандр Лукашэнка зрабіў даручэнне першаму намесніку прэм'ер-міністра Аляксандру Турчыну: «Неадкладна падключайце ўрад! «Гомсельмаш» ёсць, быў і будзе заўсёды ў краіне! Гэта 25 гадоў таму мяне запэўнівалі: маўляў, не патрэбны камбайны і «Гомсельмаш» трэба прадаць. Сёння мы бачым, што гэта добрая школа, добрая група вучоных, канструктараў. Ні ў якім разе нельга страціць гэтую школу! І тэхніка гэтая патрэбна. Але варушыцца трэба. Збірайцеся і думайце, але каб у наступным годзе мы перасталі казаць пра «Гомсельмаш» у адмоўным плане».

Прэзідэнту далажылі, што за апошнія паўгода сітуацыя на прадпрыемстве выправілася: павялічыўся экспарт, значна зменшыліся запасы гатовай прадукцыі, толькі за чэрвень удалося прадаць 400 камбайнаў.

Аляксандр Лукашэнка даў зразумець, што прадпрыемства знаходзіцца пад асаблівай увагай кіраўніцтва краіны і яму будзе аказаная неабходная дапамога. Пры гэтым ён заўважыў, што многія сённяшнія праблемы створаны з-за памылак у кадравай палітыцы. Галоўная думка кіраўніка дзяржавы — трэба клапаціцца пра пераемнасць пакаленняў і не баяцца давяраць адказныя рашэнні больш маладым.

Фота БелТА.

НЕ МОЖАШ — НЕ ГАДУЙ

Даклад старшыні Веткаўскага райвыканкама Паўла Сілівончыка Прэзідэнт перарваў словамі: «Гэта я ведаю. Скажы, што кепска». У адказ прагучала інфармацыя пра зніжэнне вытворчасці малака з прычыны леташняга недахопу кармоў. На канец года раён плануе выйсці па вытворчасці малака на 95 працэнтаў ад мінулага года.

Аднак Прэзідэнт адразу намацаў самую балючую праблему на Веткаўшчыне і ў цэлым па краіне — падзеж жывёлы. Аказваецца, толькі сёлета ў раёне загінула 800 галоў. Прычына, на думку мясцовага кіраўніцтва, — кармы. Але ў кіраўніка дзяржавы наконт прычын іншае меркаванне: «Не можаш накарміць, не разводзь, — сказаў ён. — Аддай тым, у каго ёсць корм. Навошта нішчыш жывёл?»

Генадзь Салавей пагадзіўся, што галоўная прычына — памылкі кіраўнікоў гаспадарак і парушэнне тэхналогій жывёлагадоўлі.

«Яшчэ раз паўтараю для ўрада: за падзеж жывёлы сядзеце ў турму! Па-мойму, 85 тысяч па мінулым годзе. Вы ўяўляеце, колькі гэта было б мяса?» — абурыўся Аляксандр Лукашэнка. Ён даручыў органам пракуратуры працягнуць непасрэдна займацца гэтым пытаннем і даваць вынікі. «Гэта недапушчальна! То кармы дрэнныя, то іншае. Гэта проста бесталковасць!» — рэзюмаваў Прэзідэнт.

СА СТРАТНЫХ — У ПЕРСПЕКТЫЎНАЕ

Рэспубліканскае даччынае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Беларуснафта-Асобіна» — прыклад паспяховага ператварэння стратнага прадпрыемства ў перспектыўнае з дапамогай буйнога дзяржаўнага канцэрна. «Беларуснафта» мае падобныя гаспадаркі ў кожнай вобласці, і ва ўсіх — лепшыя, чым ў сярэднім па раёне, паказчыкі. На пытанне Прэзідэнта, наколькі даводзіцца такія гаспадаркі датаваць, генеральны дырэктар РУП «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» Аляксандр Ляхаў адказаў: «Датацыі ёсць, але я лічу, што паляпшэнне адбываецца, і асабліва відавочна гэта на дадзеным прадпрыемстве». За паўгода прырост вытворчасці тут склаў 118 працэнтаў, і амаль пяціразовы за час апекавання з боку нафтавікоў. Складскія запасы цяпер ніжэйшыя за норму.

Канцэрн выкарыстаў у кіраванні сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі тыя ж прынцыпы, што і ў прамысловасці: склаў праграму росту, штогод уводзіць у эксплуатацыю новыя аб'екты і практычна абнавіў вытворчую базу. Цяпер у «Асобіна» стаіць задача нарасціць вытворчасць і збалансаваць ланцужок ад сыравіннай зоны да глыбокай перапрацоўкі. Пакуль што тут не хапае мясакамбіната, дзе больш глыбока перапрацоўвалася б птушка.

Прэзідэнт уважліва выслухаў інфармацыю пра палітыку «Беларуснафты» адносна даччыных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. «Глядзіце, каб гэтыя гаспадаркі не былі беднымі пасынкамі», — папярэдзіў ён Аляксандра Ляхава і параіў як мага хутчэй пабудаваць завод па больш глыбокай перапрацоўцы мяса птушкі.

ЗАВОДЫ БУДУЦЬ ЗАХАВАНЫЯ

Другім пунктам візіту Прэзідэнта на Гомельшчыну стала поле азімага трыцікале ўнітарнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Радуга-Агра». Тут кіраўнік дзяржавы пазнаёміўся з новай лінейкай збожжаўборачных камбайнаў айчыннай вытворчасці. Пры гэтым зноў былі закрануты праблемы холдынга «Гомсельмаш». Разам з тым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цяпер на заводзе няма разгубленасці.

«Адзіная зараз праблема — абаротныя сродкі», — прызнаўся генеральны дырэктар прадпрыемства Аляксандр Новікаў. На гэта кіраўнік дзяржавы адказаў: «Ніхто вам падарункаў рабіць не будзе. Калі трэба дапамагчы, калі ты заўтра сто камбайнаў прадаеш і штосьці вяртаеш у банк або бюджэт, канешне, грошы пазычым. «Гомсельмаш» ніхто не забудзе!»

Гэта датычыцца і іншых буйных машынабудаўнічых прадпрыемстваў краіны, незалежна ад формы ўласнасці, сказаў кіраўнік дзяржавы. «Гэта ўсё беларускае. Яны павінны даваць вынік. Заводы гэтыя будуць захаваныя, — паабяцаў Прэзідэнт. — Таму ў нечым дапаможам, але ўсё гэта павінна быць абгрунтавана і разумна. Самае галоўнае — сёння ўзяў рубель, заўтра рубель дзве капейкі вярні, многа не трэба, але падарункаў не будзе».

У гутарцы з кіраўніцтвам холдынга зайшла размова пра плённае супрацоўніцтва з Казахстанам і пра цікаўнасць апошняга да ўваходжання ў капітал беларускай кампаніі. Кіраўнік дзяржавы выказаў меркаванне, што гэта цалкам магчыма, калі ў выніку будзе выходзіць канкурэнтаздольная прадукцыя.

На полі Прэзідэнту расказалі пра мадэль газаматорнага збожжаўборачнага камбайна КЗС-4118К. Стваральнікі машыны ўпэўненыя, што за такім тыпам — будучыня. Аляксандр Лукашэнка ўчыніў, можна сказаць, вельмі строгі допыт: ці сапраўды нам патрэбныя такія машыны, у чым яны саступаюць, наколькі будуць даражэйшыя, наколькі канкурэнтаздольныя? Ён пытаўся пра гэта і ў канструктараў, і ў генеральнага дырэктара холдынга, і ў кіраўніка сельскагаспадарчага прадпрыемства, і ў працаўнікоў. Можна сказаць, што ў адказах Прэзідэнту ўсе меркаванні супадалі: вытворчасць газаматорных камбайнаў — справа перспектыўная. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што машына павінна быць даражэйшая за свае аналагі не больш чым на 10 працэнтаў і акупацца за 3,5-4 гады, тады яе вытворчасць будзе мэтазгодная.

Усяго кіраўніку дзяржавы былі паказаныя шэсць новых машын, і ён пагутарыў з камбайнерамі кожнай з іх, пры гэтым пытаўся не толькі пра перавагі і недахопы тэхнікі, але і пра асабістае жыццё, сем'і, дзяцей.

Адзін з камбайнераў Амаяк Дземярчан расказаў, што прыехаў у Беларусь з Абхазіі ў 1992 годзе. Ён запэўніў Прэзідэнта Беларусі, што яму тут жывецца добра. Дарэчы, раённая газета не аднойчы пісала пра сямейны экіпаж хлебаробаў Дземярчанаў з «Радугі-Агра», адзін з найлепшых на Веткаўшчыне.

КРАІНЕ ПАТРЭБНЫ ГЕРОІ

Прадстаўляючы кіраўніку дзяржавы блок плавальных басейнаў у горадзе Ветка, першы намеснік міністра спорту і турызму Вячаслаў Дурноў заўважыў, што мясцовае насельніцтва актыўна займаецца фізічнай культурай і спортам. 574 спартыўныя аб'екты дзейнічаюць у раёнах, якія пацярпелі ад наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. На гэта кіраўнік дзяржавы заўважыў: «Займацца фізкультурай — гэта добра, а для спорту ты адсюль хоць нешта атрымліваеш? Мы ж ствараем, грошы выдаткоўваем вялікія. Мы хоць па адным зярнятку адсюль нешта маем?» Пытанне не атрымала станоўчага адказу. Гэта не значыць, што будаваць басейны і спартыўныя пляцоўкі не трэба, але калі яны пабудаваныя, важна не супакойвацца на тым, што сюды пайшлі людзі, трэба ставіць больш амбіцыйныя задачы. «Краіне патрэбны героі», — сказаў пазней Прэзідэнт у Ветцы.

А на адрас Міністэрства спорту і турызму прагучала папярэджанне: «Токіа на носе — гэта для вас будзе самы жорсткі экзамен для ўсіх!» Трэба рыхтаваць спартсменаў, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

НА ДОБРУЮ ПАМЯЦЬ

Падчас рабочай паездкі ў Веткаўскі раён Прэзідэнту падарылі ікону ручной работы і фотаальбом, у якім праілюстраваныя шматлікія візіты кіраўніка краіны ў Гомельскую вобласць. На іконе — выява Божай маці і святых заступнікаў гомельскай зямлі. Аляксандр Лукашэнка паабяцаў, што абраз зойме годнае месца ў Палацы Незалежнасці нароўні з іконай, прывезенай з вострава Валаам.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,
Гомельская вобласць.

Напярэдадні падзеі

Свята, якое запомніцца

Пасяджэнне Нацыянальнага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства прайшло ў Слоніме пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Ігара Петрышэнкі.

Удзельнікі абмеркавалі праграму мерапрыемстваў, эскізы афармлення друкаванай прадукцыі і сцэнічных пляцовак, сцэнарны план адкрыцця свята, размяшчэнне гасцей і іншыя пытанні, паведамілі БелТА ў прэс-службе ўрада. Ігар Петрышэнка звярнуў увагу на неабходнасць дасканалай падрыхтоўкі горада Слоніма і аграгарадка Жыровічы, «каб зрабіць гэта свята для жыхароў Слоніма і Слонімскага раёна, яго гасцей самай запамінальнай падзеяй».

Цэнтральнымі падзеямі свята стануць урачыстыя цырымоніі адкрыцця і закрыцця, а таксама ўзнагароджанні пераможцаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Уся двухдзённая культурная праграма дасць жыхарам і гасцям вялікую прастору для цікавага правядзення часу. З 31 жніўня па 1 верасня пройдуць фестывалі кнігі і прэсы, падагульняльны этап рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка». Беларускія і замежныя пісьменнікі абмяркуюць актуальныя пытанні сучаснай кніжнай справы за круглым сталом.

Гатоўнасць культурных і сацыяльных аб'ектаў Слоніма да прыняцця гасцей члены аргкамітэта таксама ацанілі ў час наведвання па праграме пасяджэння.

Са спадзяваннем на лепшае

Стан пацярпелага ў Турцыі беларускага дыпламата — стабільна цяжкі

Пра гэта журналістам паведаміў **міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ:**

«У сераду каля 20 гадзін вечара саветнік па пытаннях бяспекі і адміністрацыйна-прававых пытаннях Пасольства Беларусі ў Турцыі Аляксандр Паганшаў вяртаўся дамоў разам з сынам. У пад'ездзе дома адбылося сутыкненне з былым вайскоўцам. Маем інфармацыю, што ён стаяў на ўліку ў псіханеўралагічнай медыцынскай установе, быў псіхічна неўраўнаважаны. Ён стрэліў 4-5 разоў, наш саветнік быў цяжка паранены».

Уладзімір Макей з удзячнасцю падкрэсліў, што турэцкі бок на надзвычайнае здарэнне адрэагаваў імгненна, дыпламат быў дастаўлены ў бальніцу і прааперыраваны.

«Дзякуй богу, гэтыя чатыры кулі не зачапілі жыццёва важных органаў, пасля складанай аперацыі ўрачы прыступілі да вываду яго з рэанімацыйнага стану. Спадзяёмся, што ўсё абыдзецца добра», — падзяліўся міністр.

Па папярэдняй ацэнцы, ніякай палітычнай падаплёкі ў надзвычайным выпадку, на погляд міністэрства, няма. **Міністр замежных спраў Турцыі Меўлют ЧАВУШАГЛУ** адразу звязаўся з беларускім калегам і праінфармаваў аб здарэнні, паабяцаў, што будзе зроблена ўсё магчымае для расследавання і для выратавання дыпламата

Руплівае расследаванне павінна даць агульную карціну адносна прычын таго, што здарылася.

«Магчыма, усё гэта звязана з нейкім незадавальненнем злачынца паводзінамі дзяцей, якія гулялі на панадворку. Падобна да таго, што адбыўся псіхалагічны ўсплёск, які прывёў да такога выніку. Давайце дачакаемся афіцыйных вывадаў», — адзначыў Уладзімір Макей.

Словы спачування выказаў беларускаму боку і **міністр замежных спраў Латвіі Эдгар РЫНКЕВІЧС,** сустрэча з якім адбылася ўчора ў беларускім МЗС.

Варвара МАРОЗАВА.

МУЗЫЧНАЯ ПАЎЗА НА ЖНІВЕ

Як у ААТ «Белавежскі» настрой механізатарам узнімаюць

Земляробы «Белавежскага» з Камянецкага раёна заўсёды ставяць рэкорды. Вось і на сёлетнім жніве шафёр ААТ Міхаіл Кучко перавёз з палёў дзве тысячы тон збожжа. Першым у раёне, вобласці і краіне! З гэтай нагоды яго павіншавалі старшыня райвыканкама Валянцін Зайчук, намеснік старшыні аблсельгасхарчу Віктар Бяссілка, дырэктар гаспадаркі Аляксандр Дуньковіч, прадстаўнікі прафсаюза, таварышы па працы. Вядома, былі прэміі, падарункі і песні самадзейных артыстаў.

Але песнямі, танцамі, добрым словам падчас абедзеннага перапынку тут прывячаюць не толькі перадавікоў, але і ўсіх працаўнікоў жніва. Даўняя традыцыя, усталяваная былым кіраўніком Юрыем Марозам, падтрымліваецца і зараз. «Чалавек працуе ў гэты час ад цямна да цямна. Выходзіць з хаты рана і прыходзіць позна ўвечары, калі дзеці ўжо спяць. Яму ж няма часу гартаць стужку навін у інтэрнэце, нават пацікавіцца справамі свайго пасёлка. Ён бачыць перад сабой гадзін дванаццаць адны толькі каласы, — кажа **старшыня прафкама гаспадаркі Валянцін СУПРУНОВІЧ.** — Гэту манатоннасць не вельмі лёгка трываць. Таму, вядома, кожнаму прыемна, калі падчас абеду з ім пагавораць, пацікавяцца справамі, настроем, артысты заспяваюць добрую песню. У нас так заведзена, што чалавек працы карыстаецца павагай. Маленькі канцэрт і ёсць адно з праяўленняў павагі».

Звычайна музычны дэсант на поле арганізуе дырэктар Дома культуры Ірына Герасімук. Работнікі ўстановы культуры з задавальненнем едуць на ўборку, радуюць сваім мастацтвам працаўнікоў. І не толькі штатныя работнікі, такія як Юлія Логвін. Удзельнікі самадзейнасці падтрымалі добрае пачынанне. Скажам, Васіль Палока працуе трактарыстам на мясакамбінаце, а ў свой выхадны альбо пасля змены з задавальненнем выязджае на поле, каб заспяваць. Андрэй Яговіч, інжынер-механік аддзялення «Каралін», пры любой магчымасці падключаецца да мабільнай агітбрыгады.

Спявае Васіль ПАЛОКА.

Дырэктар ДК Ірына Герасімук сказала, што была вельмі рада ў мінулую суботу, калі віншавалі перадавіка Міхаіла Кучко. Асабліва было прыемна, калі пасля атрымання падарункаў ён асобна падзякаваў за песні. «Лічым, што робім свой унёсак у агульную справу ўраджаю. Мы ж разумеем: будуць ісці паспяхова справы ў гаспадарцы — будзе падтрымка аб'ектаў культуры, адукацыі, сацыялкі».

А ўборка ў ААТ «Белавежскі» падыходзіць да фінішнай прамой. На пачатак тыдня было скошана 87 працэнтаў збожжавых, на канец тыдня артысты плануюць заспяваць дажыначныя песні. Хлебаробы атрымалі каля 43 цэнтнераў збажыны з гектара — для сёлетняга складанага лета нядрэнны вынік.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Камянецкі раён.

КАЛІ ЁСЦЬ ПЫТАННІ

Іх можна задаць падчас чарговых прамых тэлефонных ліній, якія адбудуцца 27 ліпеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. З 9.00 да 12.00 у суботу на званкі адкажуць:

старшыня БРЭСЦКАГА аблсавета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні — выконваючы абавязкі старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Генадзь Міхайлавіч САЛАВЕЙ. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алёйзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

У выхадныя спякота вернецца

На гэтым тыдні ў Беларусі ідуць дажджы, і слупок тэрмометра вагаецца ў асноўным каля адзнакі ў 20—25 градусаў цяпла.

Гэта адпавядае кліматычнай норме. Але ўжо з суботы на нашу краіну пачне накатваць хваля спякотнага паветра. Падрабязней пра надвор'е расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Надвор'е ў пятніцу будзе мала адрозніваца ад таго, якое пануе апошнія дні. На большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра — ад плюс 21 да плюс 26.

А вось у суботу ападкаў чакаецца ўжо значна меней. Яны закрануць толькі асобныя раёны. Пацяплее на пару градусаў. У нядзелю сіноптыкі ападкаў і ўвогуле не абяцаюць. Уначы тэмпература асабліва не зменіцца — будзе ад 13 да 18 градусаў цяпла. Удзень жа пацяплее яшчэ крыху ў параўнанні з суботай. Па поўдні слупкі тэрмометраў дацягнуцца да 30-градуснай адзнакі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Футбол. Ліга чэмпіёнаў

Першая частка супрацьстаяння

Футбалісты БАТЭ абыгралі нарвежскі «Русенборг» з лікам 2:1 у першым матчы 2-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў

Лік быў адкрыты ўжо на пятай хвіліне, калі Ігар Стасевіч рэалізаваў пенальці. Аднак праз 20 хвілін футбалісты нарвежскага клуба вярнулі раўнавагу — 1:1. Пасля перапынку гульцы БАТЭ працягнулі востра атакаваць, і на 52-й хвіліне Максім Скавыш вывеў БАТЭ наперад.

— Вельмі цяжкі матч. Мы гулялі з сапернікам даволі высокага ўзроўню. Нарвежскі клуб — добра навучаны і згуртаваны калектыў, які здольны гуляць на высокім узроўні, — пракаментаваў **галоўны трэнер БАТЭ Аляксей БАГА.** — У такім матчы не бывае дробязяў, неабходна ў кожным эпізодзе дзейнічаць з самаадданасцю. Пасля ўдалага пачатку сустрэчы мы павялі 1:0, але гол у адказ даказаў, што «Русенборг» здольны востра атакаваць. Другі гол у вароты нарвежцаў, на мой погляд, надаў упэўненасці футбалістам БАТЭ і зняў псіхалагічнае напружанне. Гэта толькі першая частка, упэўнены, у матчы ў адказ у Тронхейме праз тыдзень нам будзе няпроста. Тым не менш перамога над такім апанентам — яшчэ адна старонка ў гісторыі нашага клуба.

Паядынак у адказ футбалістаў БАТЭ з нарвежскім чэмпіёнам адбудзецца 31 ліпеня ў Тронхейме. У выпадку перамогі па суме дзвюх сустрэч над «Русенборгам» футбалісты БАТЭ ў трэцім раўндзе згуляюць з пераможцам пары «Марыбор» (Славенія) — AIK (Стакгольм, Швецыя). Няўдачнік супрацьстаяння чэмпіёнаў Беларусі і Нарвегіі пяройдзе ў другі па рангу кантынентальны турнір — Лігу Еўропы — і ў 3-м крузе кваліфікацыі згуляе з клубам «Сараева» з Босніі і Герцагавіны.

Адзначым, што нарвежскі «Русенборг» з'яўляецца 11-разовым удзельнікам групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў. Найбольш значных поспехаў у самым прэстыжным клубным турніры клуб дамагаўся ў сярэдзіне і канцы 90-х.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Медвядчук: «Апазіцыйная платформа» дапаможа прэзідэнту Зяленскаму прыняць закон аб статусе Данбаса

Партыя «Апазіцыйная платформа — За жыццё» гатова дапамагчы прэзідэнцкай партыі «Слуга народа» ўнесці змены ў канстытуцыю адносна статусу Данбаса, заявіў кіраўнік палітрады гэтай партыі Віктар Медвядчук.

Пры гэтым палітык удакладніў, што партыя знаходзіцца ў апазіцыі да дзеючай улады. «Але дзеля міру мы гатовы падтрымаць прэзідэнцкую партыю», — дадаў Медвядчук. Ён лічыць, што «Апазіцыйная платформа — За жыццё» разам са «Слугой народа» можа ўнесці змены ў канстытуцыю, таму што дзве будучыя фракцыі ў Радзе разам набіраюць больш за 300 галасоў, неабходных для канстытуцыйных змен. «Калі для «Слугі народа» будзе прыярытэтам мірнае ўрэгуляванне сітуацыі ў Данбасе, мы гатовы ім дапамагчы», — падкрэсліў Медвядчук.

Банкі ў Швейцарыі пачалі выдаваць крэдыты па адмоўнай стаўцы

Некаторыя банкі Швейцарыі пачалі выдаваць крэдыты інстытуцыянальным пазычальнікам па адмоўнай стаўцы, перадае Bloomberg.

Адзначаецца, што працэнтная стаўка Нацыянальнага банка Швейцарыі ўстаноўлена на ўзроўні мінус 0,75 %. Крэдытныя арганізацыі краіны вымушаныя даплочваць Цэнтрабанку за захоўванне залішніх сродкаў. Адмоўныя стаўкі таксама ўстаноўлены ў банках Даніі, Швецыі і Японіі.

Нацбанк Швейцарыі ўжо некалькі гадоў захоўвае працэнтную стаўку на адмоўным узроўні. Кошт швейцарскага франка застаецца высокім, а інфляцыя — нізкай.

У Даніі Нацыянальны банк упершыню ўвёў адмоўную працэнтную стаўку ў 2012 годзе, каб захаваць курс сваёй валюты. У 2016 годзе The Wall Street Journal пісаў, што датчанін, замест таго каб плаціць працэнты па крэдыце, узятым 11 гадоў таму, у апошнім квартале атрымаў ад банка 38 долараў — дзякуючы адмоўнай працэнтнай стаўцы па крэдыце. Выданне адзначыла, што негатыўны бок гэтай сітуацыі заключаецца ў тым, што банкі не плацяць працэнты па большасці ўкладаў, таму грамадзяне ўкладваюцца ў нерухомасць. Аднак, як адзначае газета, у выпадку празмернага росту інвестыцый на рынку нерухомасці краіне можа пагражаць фінансавы крызіс.

Нацыянальная італьянская латарэя «Супер Эналота» пабіла сусветны рэкорд

Яе джэкпот дасягнуў 195 мільёнаў еўра. Напярэдадні вечарам камбінацыю з шасці лічбаў зноў ніхто не адгадаў.

Ужо на працягу дзевяці месяцаў італьянцы і шматлікія замежныя грамадзяне, якія спецыяльна прыязджаюць у краіну, беспаспяхова спрабуюць стаць мільянерамі. Аднак, мяркуючы па колькасці прададзеных білетаў, азарт ахвотных сарваць куш няўхільна расце.

Білет на поспех у італьянскую латарэю набывалі Джордж Клуні, Элізабэт Хёрлі і Пэрыс Хілтан. Так, Клуні набыў 1000 білетаў нацыянальнай італьянскай латарэі оптам.

Вядома, што многія знакамітасці спрабавалі гуляць у «Супер Эналота», але больш за ўсіх пашанцавала Мадонне. Паведамлялася, што спявачка набыла 100 білетаў падчас свайго сусветнага турнэ 2012 года і выйграла тады прыз на суму €120 000 (Мадонна ахвяравала свой выйгрыш на будаўніцтва школы ў Малаві).

У латарэі могуць прымаць удзел людзі з любога пункта свету пры ўмове, што білет быў набыты на тэрыторыі Італіі.

КАБ БЕЛАРУСАЎ НЕ МЕНШАЛА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Таму трэба вырашаць пытанне з жыллём для сем'яў, асабліва для шматдзетных, якія павінны быць забяспечаны жыллём на працягу аднаго года з моманту пастаноўкі на ўлік. Дарэчы, сёлета ў Беларусі плануецца пабудаваць жыллё для 12 тысяч шматдзетных сем'яў.

Акрамя таго, прадстаўнік Мінпрацы і сацыяльнай абароны запэўніла журналістаў, што сацыяльныя гарантыі для сем'яў будуць захаваны. Ні Мінпрацы, ні іншыя дзяржаўныя органы на дадзены момант не працуюць над пытаннем скарачэння водпуску па доглядзе дзіцяці з трох гадоў да двух.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Кансультаванне для ўсёй сям'і

Яшчэ адна з прычын цяперашніх дэмаграфічных праблем — бясплоддзе сем'яў. «Прычым апошнім часам усё часцей прычына гэтага ляжыць у здароўі мужчыны», — кажа **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, экспертызы, зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб Міністэрства аховы здароўя Алена БОГДАН.**

Таму цяпер Міністэрства аховы здароўя працуе над нарматыўна-прававым актам, паводле якога першая спроба ЭКА ў нашай краіне будзе бясплатнай. Акрамя таго, плануюцца змены ў Законе «Аб ахове здароўя», у прыватнасці прапануецца ўвядзенне перадабортнага кансультавання, і не толькі для жанчын — гэтую практыку хочуць распаўсюдзіць на ўсю сям'ю. Гэта значыць, што на падобную кансультацыю будзе запрашацца таксама муж або партнёр жанчыны.

З інсультам — у спецыялізаванае аддзяленне

Сярэдняя працягласць жыцця ў нашай краіне цяпер 74,4 года. **Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Анатоль ДАШКО** адзначае, што па выніках мінулага года больш за 15 % жыхароў краіны былі старэйшыя за 65 гадоў. Калі тэндэнцыя захаваецца, то да 2050 года іх доля павялічыцца да 25 %. Гэтая тэндэнцыя сведчыць пра тое, што нацыя старэе.

Пры гэтым павялічваецца колькасць сем'яў, якія сутыкаюцца з такой няпростай праблемай, як узроставая дэменцыя ў старэйшых членаў сям'і. Таму Міністэрства аховы здароўя і Мінпрацы думаюць над стварэннем спецыяльных цэнтраў для пажылых людзей з дэменцыяй.

Выклікае трывогу спецыялістаў і высокі ўзровень смяротнасці мужчын працаздольнага ўзросту — ён у 4,5 разы вышэйшы, чым у працаздольных жанчын. У сувязі з тым, што на першым месцы ў нас смяротнасць ад сардэчна-сасудзістых захворванняў, Міністэрства аховы здароўя плануе абсталяваць міжрэгіянальныя і міжраённыя цэнтры ангіёграфамі і стварыць у іх спецыялізаваныя аддзяленні па лячэнні вострага каранарнага сіндрому, вострых парушэнняў мазгавога кровазвароту, цяжкіх чэрапна-мазгавых траўмаў.

Сёння такая дапамога, па словах Алены Богдан, аказваецца ў Салігорску, Баранавічах, Пінску, Оршы, Мазыры. Дзякуючы гэтаму пацыенты з вострым каранарным сіндромам, інфарктам міякарда з прылеглых тэрыторый маюць магчымасць на працягу «залатой гадзіны» паступіць у цэнтр, дзе выконваюцца сучасныя лячэбна-дыягнастычныя ўмяшанні з пастаноўкай стэнта.

Таксама для павышэння даступнасці аказання медыцынскай дапамогі тэрапеўтаў пераводзяць на работу дактарамі агульнай практыкі. У пачатку гэтага года ўжо пачаліся пастаўкі неабходнага абсталявання для аснашчэння гэтых працоўных месцаў.

Святлана БУСЬКО.

РЫХТУЙ ЦЕПЛАТРАСЫ ЛЕТАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У прыватнасці, іспыты цепласетак, якія праводзяцца ў міжацяпляльны перыяд, дазваляюць выявіць больш за 90 % усіх пашкоджанняў, якія існуюць у цепласетках. Статыстыка сведчыць, што дзякуючы гэтаму работа падчас сезона ацяплення праходзіць без працяглых аварыйных сітуацый.

У галіне ЖКГ сёлета праведзены іспыты 2628 кацельных, заменена 10 587 кіламетраў цепласетак, 28 неэканамічных катлоў, адрамантавана 518 тысяч квадратных метраў даху, 200 тысяч пагонных метраў стыкаў сценавых панэляў. Праведзена прафілактыка сістэм ацяплення ў 27 231 доме, зроблены іншыя работы. Генадзь Аксіловіч дадаў, што падрыхтоўка да асенне-зімовага перыяду вядзецца са штотыднёвым кантролем за часткай мерапрыемстваў і штомесячным кантролем за выкананнем большасці паказчыкаў.

Газавікі таксама актыўна рыхтуюцца да зімы. Насельніцтва ўжо закупіла 94,3 тысячы тон брыкету, аднак людзям раяць не цягнуць да апошняга з яго набыццём, каб не стварацца потым чэргі.

Газазабеспячальныя арганізацыі абследавалі 52,8 % падземных газаправодаў і далі ацэнку тэхнічнага стану амаль 60 % тых, што працуюць больш за 40 гадоў. Заменена 10 % газаразмеркавальных пунктаў, якія эксплуатуюцца звыш 20 гадоў.

На мясцовых відах паліва (МВП) у Мінскай вобласці працуе 544 крыніцы энергіі. У рэгіёнах вобласці сёлета запланавана ўстроіць шэсць кацельных агульнай магутнасцю 33,7 мегавата. Уведзены ўжо тры аб'екты. У выніку доля выкарыстання такога паліва арганізацыямі ЖКГ на Міншчыне дасягне 32,7 %. Гэта, у сваю чаргу, дазволіць замясціць 93,5 мільёна кубаметраў газу.

ПАД НАГЛЯДАМ ГАЗАВІКОЎ

Пасля пачатку рэструктурызацыі Міністэрства энергетыкі з красавіка ў Беларусі створаны ўстановы дзяржаўнага энергетычнага газавага нагляду. На іх базе ўводзяцца і пачынаюць функцыянаваць газавыя інспекцыі, якія будуць займацца правіламі выкарыстання газу ў быце, паведаміў **Аляксандр АЗЯРЭЦ, генеральны дырэктар дзяржаўнай установы «Дзяржаўны энергетычны і газавы нагляд».**

Работа распачата па ўсіх абласцях, і акцэнт робіцца на праблемных пытаннях, якія цягнуцца з году ў год. Напрыклад такіх, як невыкананне арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў, нездавальняючы стан цеплаізаляцыі трубаправодаў і абсталявання, невыкананне або няпоўнае выкананне гідрапнеўматычных прамывак і гідраіспытаў цеплаўстановак і цепласетак, адсутнасць у персаналу сродкаў электратэхнічнай абароны і запорных прылад на электраўстаноўках, а таксама знакаў бяспекі на шчытках прыбораў.

У краіне налічваецца 28 857 спажыўцоў цеплаэнергіі і 13 768 ведамасных цеплакрыніц.

— Звяртаем таксама ўвагу на аўтаномныя крыніцы, якія павінны будуць падключацца ў выпадку нестандартных сітуацый у перыяд ацяплення, каб яны былі гатовыя і спраўныя. Неабходна адсочваць таксама графікі абследаванняў тэхнічнага стану газавага абсталявання і ўнутраных газаправодаў жыллёвага фонду, у прыватнасці выдачу дакументаў аб праверцы працаздольнасці дымавых і вентыляцыйных каналаў.

У Ваўкавыску, напрыклад, гарачую ваду адключаюць у сярэднім на 10 сутак, у Навагрудку — на тыдзень, а ў раёнах Слоніма, якія абслугоўваюцца жыллёва-камунальнымі службамі, — увогуле на 3-4 дні.

Задача энергетыкаў — прадугледзець усе магчымыя вузкія месцы накшталт расчысткі прасек ліній электраперадачы сумесна з лясгасамі, каб цепла- і электраэнергія паступалі да насельніцтва і на прадпрыемствы бесперабойна. Рамантуецца энергетычнае абсталяванне, мяняюцца і рамантуюцца цепла- і электрасеткі, праводзяцца супрацьаварыйныя трэніроўкі з аператыўным персаналам.

— Рамонт электрасетак усіх класаў напружання выкананы на 46 %, гэта 11 774 кіламетры. 19 адзінак цеплатэхнічнага абсталявання адрамантавана і 17 знаходзяцца ў рамонце з 52 запланаваных на год. Гэтыя работы выконваюцца круглы год, бо гідраэлектрастанцыі, напрыклад Лукомская ці Бярозаўская, у асноўным рамантуюцца ўзімку, — расказаў **Уладзімір БАБРОЎ, першы намеснік генеральнага дырэктара, галоўны інжынер «Белэнерга».** *— Сумесная з лясгасамі работа па ўпарадкаванні палос лесу, якія прылягаюць да прасек ліній электраперадачы, дазваляе зменшыць колькасць агульных адключэнняў, звязаных з дрэнным надвор'ем.*

Папаўняюцца аварыйныя запасы паліва, неабходныя для функцыянавання энергасістэмы ў крытычных сітуацыях пры недахопе забеспячэння прыродным газам. Перш за ўсё гэта мазут, якога цяпер у спецыяльных сховішчах больш за 320 тысяч тон з неабходных па плане 350 тысяч тон. Энергетыкі ўключылі ў работу яшчэ дзве лініі электраперадачы.

Сіламі энергетыкаў і атамшчыкаў уключаны ў нармальную работу пад поўны рэжым лініі Мінск-Паўночная і Смаргонь, што дадаткова павялічвае надзейнасць і эксплуатацыйныя магчымасці сетак айчыннай энергасістэмы.

Ірына СІДАРОК.

Запрашальнік

У госці да Максіма

Ужо ў гэту нядзелю адбудзецца паэтычны фестываль «Ракуцёўскае лета — 2019». У літаратурна-мемарыяльны музей Максіма Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына» завітаюць нашчадкі паэта і Эміліі Луцкевіч.

Арганізатары фэсту запрашаюць усіх ахвотных далучацца да свята — хто ведае, магчыма, пазней менавіта ваша гісторыя наведвання гэтага месца стане легендарнай?.. У 11 гадзін распачнецца прывітальная імпрэза каля памятных камянёў. Ужо праз гадзіну — літаратурна-музычная імпрэза. З 12 да 16 гадзін пройдуць майстар-клас па напісанні лімерыкаў і інтэлект-трэніроўка ад ПЭН-цэнтра, гульні «Падарожжа з Вільні ў Мінск», «Літаратурны кракадзіл», «Музейная шуфлядка», квэст па экспазіцыі, а таксама майстар-клас па выцінанцы.

Варта адзначыць, што ўжо мінула 25 год з таго моманту, калі літаратурна-мемарыяльны музей Максіма Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына» прыняў першых наведвальнікаў. Менавіта ім, першым, пашчасціла акунуцца ў атмасферу старасвецкага фальварка, на свае вочы ўбачыць «Дом гаспадара», што ласкава прымаў беларускага паэта з далёкага Яраслаўля, наведаць экспазіцыю ў адноўленым «Дамку арандатара», зазірнуць у гумно і наталіць смагу з крыніцы «жывой вады», пра якую некалі напісаў паэт...

Цяпер у «Фальвараку Ракуцёўшчына» адкрылася экспазіцыя ў «Доме гаспадара». Яе экспанаты знаёмяць з жыццём былога гаспадара Вацлава Лычкоўскага і яго гасцей, апавядаюць пра Эмілію Шабуню і яе маленькую дачку Яніну, якія былі побач з Максімам два летнія месяцы і пакінулі ўспаміны пра маладога паэта.

У самых актыўных і спрытных гасцей ёсць магчымасць трапіць на свята ў складзе арганізаванай групы з Літаратурным музеем Максіма Багдановіча (тэлефон (8017) 334-42-69), кошт білетаў — 10—15 руб. Самастойна дабрацца ў фальварак можна на электрычцы Мінск—Маладзечна, Маладзечна—Мінск (станцыя Уша) ці маршрутным таксі Мінск—Краснае, Мінск—Маладзечна (вёска Краснае).

Варвара ГОМАН.

Кожнаму сваё

«Звязда» не так даўно пісала, што ў нас пачалося жніво, і гэтай навіной нагадала...

Зрэшты, па парадку.

Чыстую праўду скажу: мара ўсіх бацькоў — каб дзецям жылося лепш, каб яны (тут варыянтаў шмат) не зведалі нястачы, выбіліся ў людзі, парабілі кар'еры, вырваліся з вёскі, не жылі ў інтэрнатах і на здымных кватэрах, само сабой — удала ажаніліся-выйшлі замуж, сталі багатыя, пабачылі свет і «тэдэ», як той казаў, і «тэпэ».

Для гэтага яшчэ малых сынкоў і дачушак запісваюць у розныя секцыі-гурткі, у профільныя класы і школы, паступова, але досыць настойліва падштурхоўваюць да выбару пэўных жыццёвых сцежак, якія проста павінны пачынацца з вучобы ў ВНУ...

Праўда, апошнім часам акцэнты трохі змяніліся: хтоніхто цяпер кажа, што можна і без гэтага, што не варта гадамі «сушыць мазгі».

Але ж калі я быў малады, лічылася, што варта, што «без паперкі (чытай без дыплома) ты кузурка, а з паперкай — чалавек!» Не так важна, дзе навучаўся і чаму канкрэтна, — галоўнае, каб дыплом атрымаў.

Дык вось. Быў у нашай групе адзін студэнт — Міколам звалі. Недурны вясковы хлапец, неблагі, а ўжо ж знаходлівы... Чаго ён толькі не выдумляў, каб на заняткі не хадзіць! «Пераканіў» усіх братоў ды сясцёр — родных, стрыечных (асобных, як здавалася, нават двойчы ці тройчы), пралячыў-пахаваў сваіх бабуль і дзядуль, многіх цётак і дзядзькаў, на вакзале ў Мінску сустрэў проста безліч гасцей-інвалідаў, якіх трэба было суправаджаць у вёску...

Адпаведна, з першай спробы ён не здаваў экзамены ніколі, нават на пачатку вучобы, што ўжо казаць пра сярэдзіну, калі з трэцяга курса пачаліся вывучэнне новых спецыяльных дысцыплін, падрыхтоўка мноства курсавых. Круціўся наш Мікола, як той заяц з-пад купіны: не зрабіў нешта адно — не дапускалі да другога, потым да трэцяга... Студэнт «абрастаў» такімі «хвастамі», што дапамагчы яму не маглі нават мы — усе разам.

Карацей, загрымеў наш Калян пад фанфары — адлічылі яго. Маці яшчэ, помню, прыязджала, хадзіла ў дэканат, з горкім плачам даводзіла там, які ж яе Колька працаўнік, які харошы хлопец і як бы *ёй* хацелася, каб сынок давучыўся...

Чаго хацеў сам Мікола, мы даведаліся таксама, але праз некалькі месяцаў і... з газеты. Прычым не з нейкай там невялічкай, раённай, а з рэспубліканскай!

Значыць, аднойчы бяру яе ў рукі і вачам не веру: на першай старонцы — вялізны здымак, і на ім... На заднім плане — камбайн, на пярэднім — Мікола. А ўжо ж загарэлы, вясёлы, шчаслівы! Ад чаго? З загалоўка вынікала: «Чалавек на сваім месцы»! З подпісу — што жніво гэта для маладога камбайнера самае першае, што збожжа ён намалаціў больш за ўсіх, што ў гаспадарцы (і нават раёне!) на яго раўняюцца іншыя, што Міколам ганарыцца сям'я і ўвогуле, калі б такіх работнікаў было больш...

Ну вось, думаю, а мы тут з сябрамі прымушалі яго «вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца», за вушы цягнулі з курса на курс, на камсамольскіх сходах разбіралі. Не трэба было, бо кожнаму і сапраўды сваё!..

Вось толькі адшукаць яго шчасціць не кожнаму.

Іван Гаральчук,
г. Мінск.

Жыві ды радуйся!

...На вуліцу, да гандлёвых радоў, гэта варона прылятала кожную раніцу, і таму жанчыны, што прадавалі гародніну, пазнавалі яе здалёк: не толькі па сіваватa-попельнай афарбоўцы — па незвычайных, досыць шляхетных паводзінах. Ну, у прыватнасці, птушка, падабраўшы кавалачкі хлеба, ніколі адразу ж не адлятала. Яна, ветліва павярнуўшыся ў бок гандлярак ды смешна расставіўшы крылы, выдавала дзіўныя гарлавыя гукі, вельмі падобныя на... слова: «Р-рада!»

— Ну трэба ж! — у чарговы раз пачуўшы яго, дзівілася самая гаваркая прадавачка. — Варона і тая радуецца жыццю, а мы, людзі, усё гаруем. Усё нам дрэнна ды сумна жыць.

— Што праўда, тое праўда, — цяжка ўздыхнуўшы, пагадзіўся з ёй мужчына-пакупнік.

— ...А ўсё чаму? — працягвала гандлярка. — Таму, што перасталі бачыць самыя, здавалася б, простыя, добрыя рэчы — сонца, кветкі, траву... У госці амаль не ходзім. Раней — ну было ж, успомніце! — гарыць на падваконні свечачка, значыць, заходзь, добры чалавек, — будзем табе рады... А цяпер што — паўтыкаліся ўсе ў свае камп'ютары і ніякіх зносін-размоў. Нават закаханыя часам сустрэнуцца і, можна сказаць, не ўбачацца — праз сецівa «размовы» вядуць, быццам не людзі, а нейкія робаты... І галоўнае — што з гэтым амаль ніхто не змагаецца. Хіба... Я ў часопісе неяк чытала: гаспадар адной кавярні надпіс на дзвярах павесіў: маўляў, Wi-Fi ў іх няма. І не таму, што яны скупыя ці такія ўжо беражлівыя, — проста хочуць, каб наведнікі паглядзелі на іншых людзей ды пагаварылі з тымі, з кім прыйшлі... Добра ж прыдумаў, праўда? Можа, хоць на пару гадзін і хоць некага ачалавечыць — прымусіць нейкую птушку ўбачыць... Ну гляньце: звычайная ж, як быццам, варона, а нам з вамі прыклад падае. Крошкі з зямлі сабрала і радуецца. Разумніца! На́ вось табе яшчэ — еш...

Расчуленая прадавачка, пакрышыўшы ў руках, кінула вароне лустачку хлеба, а потым і... ладны абаранак.

Варона паволі, з пачуццём уласнай годнасці, акуратна падабрала частунак — спачатку драбнейшы, а потым, уважліва паглядзеўшы па баках, дзюбай падчапіла і большы...

— Мусіць, з сабой хоча ўзяць, але ж як?! — засмяяўся нехта з гандлярак і тут жа ўбачыў-даведаўся, бо птушка спрытна падкінула здабычу ўверх, потым — як сапраўдны жанглёр — падставіла галаву. Абаранак — што б вы думалі?! — акуратна павіс на шыі, і зараз заставалася хіба адно: галантна адставіўшы крылы, пракартавіць любімае: «Р-рада!».

— Во дае! — ні вачам, ні вушам не верыў мужчына-пакупнік. — Варона... А, бач, здагадалася, як абаранак панесці!

— Ды што там, — засмяяліся прадавачкі, гледзячы ўслед адлятаючай птушцы, — яна здагадалася, як настрой нам падняць! Ну вы ж праўда, — казалі яны мужчыну, — да нас як тая хмара прыйшлі. А цяпер? Іншы твар у чалавека! Прычым з усмешкай — нашмат маладзейшы і прыгажэйшы! Значыць, недарма варона старалася! Часцей усміхайцеся! Рукі-ногі цэлыя, галава на плячах, у кашальку сёе-тое водзіцца — дык чаго сумаваць?.. Вось вам вашы агуркі з памідорамі. Ешце на здароўе і радуйцеся! З вас — рубель і яшчэ дзевяноста капеек.

Валянціна Паліканіна,
г. Мінск.

Хто каго правучыў?

Тыя невыносна цяжкія пасляваенныя гады забыць немагчыма. Голад даймаў усіх, але дзяцей, здаецца, найболей, бо ім жа расці і расці, а ў вёсцы ні табе кароў, ні свіней, ні курэй... Ды што там пра мяса-малако... Бульбы і той не хапала ўдосталь. Буракі, праўда, былі, параная бручка (гарбузы — гэта ўжо ласунак).

Каб выжыць, асобныя з нашых вяскоўцаў ехалі ў Заходнюю Беларусь, працавалі на хутарах, зараблялі сабе збажыны. А калі ўжо вельмі пашанцуе, дык прывозілі па некалькі курэй — на развод — ці нават парасят. Гадавалі іх тады да Каляд, а на свята...

У той год — дзеці ведалі — аж у трох гаспадароў было свежае мяса. Значыць, можна пайсці калядаваць...

Гэта, вядома ж, строга забаранялася, аднак жаданне з'есці дадатковы кавалачак хлеба ці праснака (ды яшчэ каб з салам!) перамагала страх. А далей збіралася група з падлеткаў і малых. Першыя служылі аховай — сачылі, каб «атрад» не трапіў на вочы настаўнікаў, другія ішлі пад вокны — стукалі ў шыбы, клікалі ці будзілі гаспадароў і спявалі, што ўмелі:

Калядзін, калядзін —
Я ў мамкі не адзін,
Маю драны кажушок,
Дай, бабуля, піражок.
Піражка замала,
Дай дзіцяці сала
Ці найлепей — каўбасу,
А то хату разнясу!

Гэткія спевы, ды і самі «калядоўшчыкі», вядома ж, раздражнялі багацейшых гаспадароў, у якіх была свежаніна, бо дзяцей тады было шмат — прыйдзе адзін гурт, праз паўгадзіны другі... А дзе ты ўсім набярэшся, калі корміш тое свінчо то зеллем, то жалудамі? Ад іх жа сала з мясам не дужа нарасце. Сабе б якую страву закрасіць...

Прыкладна так разважалі ў хаце каваля Сцяпана. І таму, пачуўшы чарговы стук у шыбу ды спевы, гаспадар сам выйшаў на ганак, сказаў малым, што не па правілах яны віншуюць людзей. З тым жа поспехам маглі б, маўляў, і гімн Савецкага Саюза спяваць.

— Словы яго хоць помніце? — спытаў у малых.

— Не...

— А каўбасы хочаце?

— Яшчэ і як... Толькі дай! Ага! — наперабой адазваліся дзеці.

— ...Дык спачатку гімн развучыце, тады і атрымаеце. А пакуль — хопіць з вас семак.

На гэтым слове ў торбу для прысмакаў каваль насыпаў гарбузікаў, а потым — дзеці як не памлелі — паклаў туды... каўбасу?! Можна сказаць, цэлы верч, а ўжо ж пахкі!..

Сенька ледзь утрымаў тую торбу і «здаўся» адразу: вырашыў хоць трошкі крадком адламаць і з'есці! Ён нават паспрабаваў быў, схаваўшы колцы за пазуху, але каўбаса чамусьці не ламалася...

І вось, нарэшце, канец калядаванню. Дзеці сышліся ў хаце, каб па-брацку падзяліць прысмакі ды разам з'есці. У Сені з-пад адзежак даставалі каўбасу. Перш чым падзяліць, злічылі колькасць «ратоў» і прыкінулі даўжыню кавалачкаў, потым узялі найвастрэйшы нож, каб парэзаць. Але з гэтага... нічога не атрымалася — каўбаса была цвёрдай, што тое дрэва. Чаму? Таму што замест фаршу (старэйшыя хлопцы тут жа згледзелі) у свіную кішку быў запхнуты канец таўставатай канаплянай вяроўкі...

Пасмяяўся каваль з калядоўшчыкаў!

А потым яны, раззлаваныя, як змаглі пасмяяліся з каваля: знялі яго дыхтоўныя вароты, на санях зацягнулі на другі канец вёскі да плота ўдавы Захарыхі.

Назаўтра ў вяскоўцаў толькі і гутаркі было, што пра гэтыя «жарты»! А таму не дзіва, што галоўнага «жартаўніка» (і за вочы, вядома ж) людзі сталі зваць хто Каўбасой, хто Вяроўкай.

...Даўно гэта было, але ж многія з калядоўшчыкаў яшчэ жывыя. А вось каваля — няма, і яго мянушкі цяпер носяць дзеці.

Ніна Кандрашонак,
г. Петрыкаў.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Блізкая гісторыя

Што шукаюць на востраве Кляштар?

Пад Браславам 1 жніўня пачнуцца не зусім звычайныя археалагічныя раскопкі. Што тут дзіўнага, скажаце вы — лета, якраз самы сезон для экспедыцый. І яно было б так, калі б праект «Востраў Кляштар» не ініцыявалі самі месцічы — дакладней, некамерцыйная арганізацыя Цэнтр рэгіянальнага развіцця «Браслаў». Ідэю раскопак падтрымалі ў Нацыянальным парку «Браслаўскія азёры», на тэрыторыі якога і размяшчаецца востраў з рэшткамі манастыра, што стаяў тут у 1500-х.

СКАРПІЁН. У пачатку тыдня можаце стаць проста незаменным работнікам, чым бы вы не займаліся. Вас чакае шмат кантактаў, не выключаны кароткія паездкі, пераважна — дзелавога характару. У аўторак не адмаўляйце сабе ў прыемных зносінах. У пятніцу можаце спадзявацца на дапамогу з боку начальства ці старэйшых сваякоў.

СТРАЛЕЦ. З'явіцца шанц для паспяховай самарэалізацыі на работы. Каб дабіцца пастаўленай мэты, ёсць сэнс аб'яднаць намаганні з іншымі людзьмі. Надышоў час задумацца аб ажыццяўленні сваіх жаданняў. Серада стане не самым лепшым днём для тых, хто будзе знаходзіцца ў дальняй паездцы ці камандзіроўцы.

КАЗЯРОГ. Тыдзень абяцае прыемныя і карысныя знаёмствы. Верагодныя ўдалыя перагаворы аб супрацоўніцтве. Перш чым прыняць канчатковае рашэнне па важным пытанні, уважліва ўсё абдумайце. І тады ў вас абавязкова ўсё атрымаецца. У самых рашучых прадстаўнікоў знака можа з'явіцца магчымасць стварыць сумеснае прадпрыемства ці нават пачаць сваю справу.

ВАДАЛІЎ. Каб зрабіць тое, што запланавалі, спатрэбяцца пэўныя намаганні і ўпэўненасць у сабе і сваіх дзеяннях. Засяродзьцеся на самым галоўным. Не звязвайцеся з сумнеўнымі праектамі, а тым больш не рызыкуйце рэпутацыяй.

РЫБЫ. Жыццё будзе стракацець рознымі фарбамі. Работы шмат, але не імкніцеся зрабіць усё адразу. Лепш не нарабіць памылак. Можа спатрэбіцца творчая імправізацыя, пунктуальнасць і сабранасць. Калі скарыстаеце гэтыя якасці, поспех не абміне вас.

А вы ведалі, што?..

✓ **Зялёны колер акуляраў начнога бачання Goggles тлумачыцца тым, што чалавечае вока здольнае адрозніваць больш адценняў гэтага колеру, чым якога-небудзь іншага.**

✓ На чатырох брытанскіх атамных падводных лодках у асаблівых сейфах захоўваюцца ідэнтычныя, напісаныя ўручную асабіста прэм'ер-міністрам Брытаніі, «лісты крайніх мер». У іх утрымліваюцца ўказанні камандзірам субмарын на выпадак ядзернай катастрофы і знішчэння брытанскага ўрада. Камандзіры маюць права ўскрыць гэтыя лісты ў тым выпадку, калі радыё 4 BBC спыніць вяшчанне — гэта лічыцца прыкметай гібелі цывілізаванага грамадства Брытаніі.

✓ **Гарадскія птушкі навучыліся выкарыстоўваць цыгарэтныя недакуркі ў медыцынскіх мэтах: палены нікацін дзейнічае як інсектыцыд і дапамагае птушкам пазбаўляцца ад кляшчоў, вошай, блох і іншых паразітаў.**

Даты Падзеі Людзі

26 ЛІПЕНЯ

У краіне

1875 год — дзень нараджэння Марціна Кухты, друкара, выдаўца кніг на беларускай мове. У 1906 годзе заснаваў у Вільні друкарню з правам друкаваць кнігі на ўсіх еўрапейскіх мовах. Адным з першых пачаў легальна друкаваць творы Ф. Багушэвіча, М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі, у тым ліку і забароненыя царскай цэнзурай. Выдаваў этнаграфічныя матэрыялы, літаратурныя альманахі, календары, а таксама беларускія песні з нотамі. Дзякуючы друкарскаму станку выдаўца выходзілі ў свет газеты «Наша доля» і «Наша ніва». Памёр у 1941 годзе.

1903 год — пачала дзейнічаць мінская арганізацыя РСДРП. Была створана на аснове групы газеты «Искра», якая аб'ядноўвала вакол сябе каля 30 рабочых чыгуначных майстэрняў. З сакавіка 1904 года ўваходзіла ў Паўночна-Заходні камітэт РСДРП, са жніўня 1905-га — у Паўночна-Заходні саюз РСДРП. У канцы 1905 года налічвала каля 1000 членаў. Мела 17 прапагандысцкіх груп. Кіравала дзейнасцю груп у Бабруйску, Барысаве, Навагрудку, Слуцку. У рэвалюцыю 1905—1907 гадоў узначальвала выступленні працоўных, выдавала газету «Минский летучий листок». Удзельнічала ў стварэнні прафсаюзаў, устанавіла сувязі з арганізацыямі РСДРП Пецярбурга, Масквы, Адэсы і іншых гарадоў. Арганізавала мінскі перасыльны пункт нелегальнай літаратуры. Разгромлена паліцыяй напярэдадні Першай сусветнай вайны ў ліпені—жніўні 1914 года.

1915 год — створаны Мінскі аддзел Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны — адзін з цэнтраў беларускага нацыянальнага руху; дзейнічаў да канца 1917 года.

1941 год — пасля працяглых і зацятых баёў нямецкія войскі захапілі г. Магілёў (акупацыя горада доўжылася да 28 чэрвеня 1944 года).

У свеце

1856 год — нарадзіўся Джордж Бернард Шоу, англійскі драматург і пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1925). Аўтар п'ес «Цэзар і Клеапатра», «Пігмаліён», раманаў «Неразумны шлюб», «Каханне артыста» і іншых. Памёр у 1950 годзе.

1928 год — нарадзіўся Стэнлі Кубрык, амерыканскі і брытанскі кінарэжысёр, фатограф і прадзюсар, адзін з самых уплывовых кінематаграфістаў другой паловы XX стагоддзя. Паставіў фільмы «Спартак», «Касмічная адысея», «Завадны апельсін» і іншыя. Лаўрэат шматлікіх прэстыжных прэмій у галіне кінамастацтва. Памёр у 1999 годзе.

1943 год — нарадзіўся сэр Мік Джагер, брытанскі рок-музыкант, кампазітар, акцёр і прадзюсар, адзін са стваральнікаў гурта «Ролінг стоўнз». Двойчы ўладальнік прэміі «Грэмі».

1947 год — у ЗША быў падпісаны Закон аб нацыянальнай бяспецы, у адпаведнасці з якім было створана Цэнтральнае разведвальнае ўпраўленне.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.13	21.19	16.06
Віцебск —	4.56	21.15	16.19
Магілёў —	5.03	21.09	16.06
Гомель —	5.07	20.58	15.51
Гродна —	5.29	21.33	16.04
Брэст —	5.37	21.26	15.49

Месяц

Апошняя квадра
25 ліпеня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Антона, Гаўрылы, Івана, Сцяпана, Юльяна.*
К. *Ганны, Гражыны, Міраславы, Аўхіма, Лаўрэнція.*

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

За 10 гадоў сямейнага жыцця я вельмі вырас у вачах жонкі!

З «маленькага катка» да «здаровага казла»...

— Як загадзя даведацца, што вам дастанецца толькі палова вашага стэйка?

— Калі перад наведваннем рэстарана дзяўчына кажа: «Я буду толькі салату».

Бабулька на лаўцы:

— А вы да каго?

Мая мама:

— У мяне тут дачка жыве ў 133 кватэры.

Бабулька:

— А-а-а, ведаю яе! Добрая дзяўчынка, хлопцаў да сябе не водзіць!

Мая мама:

... *Цяжка і сумна ўздыхае*.

НЕЦВЯРОЗЫ КІРОЎЦА НЕЦВЯРОЗЫ КАПІТАН

carcatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2349. Нумар падпісаны ў 19.30 25 ліпеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

26 ліпеня 2019 г. № 30 (515)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Фота БелТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЖЫЦЦЁ ВІРУЕ НА ПАМЕЖЖЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У верасні Гродзенская вобласць адзначыць знамянальную падзею — 75-годдзе свайго заснавання. Да юбілею вобласць атрымае нямала падарункаў. Да гэтай даты ўводзяцца чатыры сацыяльна значныя аб'екты — дзве школы, дзіцячы садок і Палац творчасці. У Гродне будуць адкрыты новыя маршруты, парк грамадскага транспарту папоўняць 10 аўтаномных тралейбусаў.

Напярэдадні свята ў раёнах пройдуць дні прадпрыемстваў. У рэгіёне нямала значных прадпрыемстваў, чыя прадукцыя вядомая і папулярная ў краіне. Будуць ушанаваны найлепшыя працаўнікі ўсіх сфер дзейнасці, заслужаныя работнікі — прыклад прафесіяналізму і адданасці справе.

Убачаць свет дзевяць новых выданняў, якія прысвечаны Гродзеншчыне. У рэгіёне будзе ажыццяўляцца праект «На мяжы гісторыі», які ўключае ў сябе больш за 70 захапляльных і пазнавальных вандровак па самых цікавых мясцінах Прынёмання. Такія экскурсіі пройдуць ва ўсіх раёнах і стануць прэзентацыяй новых турыстычных маршрутаў. Велічным абяцае быць і заключнае мерапрыемства, якое адбудзецца 20 верасня ў абноўленай зале абласной філармоніі. У ім прымуць удзел ганаровыя госці, а таксама дэлегацыі з усіх раёнаў.

«Звязда» таксама не застанецца ўбаку ад гэтай важнай падзеі. Сёння мы даём старт сумеснаму праекту нашага выдання і мясцовых уладаў Гродзеншчыны. Мы раскажам, як жывуць і працуюць жыхары Іўя, горада, які называюць «сталіцай татар». Здзейснім падарожжа ў Мір, каб даведацца, як развіваецца турыстычная інфраструктура. Пройдзем па безбар'ерным Гродне, дзе вырашаюцца праблемы інклюзіўнага пражывання. А яшчэ завітаем у зялёны куток жылога мікрараёна, дзе створаны сапраўдны дэндрарый, таксама пазнаёмімся з актыўнай жанчынай, начальнікам камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, якая імкнецца абудзіць ініцыятыву жыхароў.

Мы будзем працягваць праект і знаёміць нашых чытачоў з Гродзенскім рэгіёнам напярэдадні яго слаўнага юбілею.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на стар. 4—16

ЭКАНОМІКА І РЭГІЁНЫ

Партнёрскія стасункі

Каля 15 дагавораў аб супрацоўніцтве і 20 камерцыйных кантрактаў плануецца падпісаць падчас Першага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана, які адбудзецца ў Мінску 29—30 ліпеня

Аб гэтым паведаміла журналістам намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна ШЧОТКІНА перад пашыраным пасяджэннем арганізацыйных камітэтаў дзвюх краін.

На неабходнасць правядзення форуму на самым высокім узроўні звярнуў увагу **старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ**, адкрываючы пасяджэнне аргкамітэтаў:

— Мерапрыемства вельмі адказнае — яно праходзіць у рамках візіту прэзідэнта Узбекістана ў нашу краіну, — падкрэсліў ён.

Як паведаміла віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента, Першы Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана можна лічыць незвычайным, бо ён мае адрозненні ў падыходах, згодна з якімі адбываецца падрыхтоўка да аналагічных Форумаў рэгіёнаў Беларусі і Расіі. З беларускага боку тут задзейнічаны ўрад і Нацыянальны сход (Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі).

— Аснова форуму — гэта «дарожная карта» супрацоўніцтва, распрацаваная па даручэнні кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі падчас яго візіту ва Узбекістан, і падпісаная прэм'ер-міністрамі, — адзначыла яна. — Цяпер неабходна прааналізаваць, якім чынам выконваецца гэты дакумент, як функцыянуе тавараправодная сетка, якім чынам развіваюцца новыя сумесныя прамысловыя прадпрыемствы, як бакі супрацоўнічаюць у IT-сферы і гэтак далей.

Менавіта таму арганізатары прынялі рашэнне пабудаваць работу форуму па трох асноўных кірунках, якія будуць разглядацца на тэматычных секцыях: першая ахопіць работу аграпрамысловага сектара (за яе адказвае ўрад), другая закране пытанні ў сферы прамысловай кааперацыі (гэта зона адказнасці Палаты прадстаўнікоў), і трэцяя будзе датычыцца супрацоўніцтва ў сферы IT-тэхналогій, сумеснага развіцця навукі і адукацыі (за арганізацыю яе работы нясе адказнасць Савет Рэспублікі).

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Саюзныя праграмы

Для павышэння ўзроўню жыцця людзей і развіцця памежных тэрыторый. стар. 2

Да змен гатовы

Атрымаць больш паўнамоцтваў, а разам з тым і адказнасці, мясцовыя ўлады не баяцца. стар. 4

Без бар'ераў

Ці могуць людзі з абмежаванымі магчымасцямі адправіцца ў вандроўку самастойна? стар. 14

Дэндрарый паміж высотак



Былы авіятар самастойна зрабіў са звычайнага двара шыкоўны кветнік. стар. 16

РЭЗЕРВЫ ДЛЯ РЭГІЁНАЎ

Міжрэгіянальныя стасункі надаюць асаблівы імпульс гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву паміж беларускімі і расійскімі рэгіёнамі. «Магілёўхімвалакно», «Магілёўліфтмаш», «Белшына», «Сервалюкс», «Магатэкс», «Бабуліна крынка», «Чырвоны харчавік» — тавары пад брэндам «Зроблена на Магілёўшчыне» ведаюць практычна ва ўсіх кутках Расіі.

— Расійская Федэрацыя была і застаецца прыярытэтным рынкам збыту для нашых прадпрыемстваў, — паведаміў на тэматычнай секцыі VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі **губернатар Магілёўскай вобласці Леанід ЗАЯЦ.** — Але сёння мы пераходзім ад простых тавараабменных адносін да кааперацыйных. Напрыклад, «Магілёўліфтмаш» мае на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі больш за 70 дылераў, некалькі зборачных вытворчасцяў, шэраг сэрвісных цэнтраў, удзельнічае ў рэалізацыі двух сумесных праектаў. Эфектыўна дзейнічаюць на тэрыторыі вобласці больш за 300 арганізацый з расійскім капіталам. Сярод іх «Данон-Шклоў» па вытворчасці малочнай прадукцыі, «Дахавы завод «ТэхнаНІКОЛЬ», які вырабляе будаўнічыя матэрыялы. Маштабны інвестыцыйны праект рэалізуе ў Магілёве прадпрыемства па выпуску тэхнічнага вугляроду «Омск Карбон Магілёў». На яго рэалізацыю інвестарам ужо накіравана больш за 80 мільёнаў долараў, створана 300 рабочых месцаў. Сёння мы прапрацоўваем пытанне падваення вытворчых магутнасцяў магілёўскага прадпрыемства па вытворчасці жэлаціну «Мажэліт» з удзелам расійскай кампаніі «Колва». За апошнія пяць гадоў тавараабарот Магілёўскай вобласці з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі склаў больш за 10 мільярдаў долараў.

Леанід Заяц звярнуў увагу і на найбольш балючыя моманты, якія павінны вырашацца, бо датычацца агульных інтарэсаў дзвюх краін.

— Па-першае: трэба актывізаваць абарону беларуска-расійскага рынку ад шэрагу тавараў, які трапляюць да нас: у прыватнасці гэта шынная прадукцыя з Кітая, якая завозіцца цераз Казахстан, цэлы пералік тавараў машынабудаўнічага комплексу. Па-другое: пэўныя праблемы ёсць унутры рынку Саюзнай дзяржавы. Напрыклад, сітуацыя з Магілёўскім прадпрыемствам «Магатэкс», якое сутыкаецца з пэўнымі абмежаваннямі пры супрацоўніцтве з расійскімі партнёрамі. На беларускія тканіны не распаўсюджваецца дзеянне загада Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Расійскай Федэрацыі па выкарыстанні страхавых узносаў на забеспячэнне расходаў на набыццё спецыяльнага адзення. Па-трэцяе: асаблівую заклапочанасць у нас выклікае пратакол паміж урадам і Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, які датычыцца гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў галіне экспарту нафты і нафтапрадуктаў, згодна з якім не толькі беларускія, але і расійскія кампаніі, якія рэалізавалі праекты ў Магілёўскай вобласці, пазбаўленыя квот на вытворныя нафтапрадуктаў. Гэта негатыўна адбіваецца на далейшых перспектывах развіцця прадпрыемства групы кампаній «ТэхнаНІКОЛЬ». І гэта толькі асобныя аспекты нашага супрацоўніцтва. Лічу, што мы маем вельмі вялікі патэнцыял у далейшым будаўніцтве Саюзнай дзяржавы. А праблемы для таго і існуюць, каб вырашаць іх разам і знаходзіць кампраміс.

Кантракты

Два вялікія кантракты на пастаўку ў Расію прадукцыі агульнай сумай 5,5 мільярда расійскіх рублёў падпісала на Форуме рэгіёнаў магілёўскае прадпрыемства «Магілёўхімвалакно». Сёння Расія спажывае 48 % поліэфірнай прадукцыі гэтага вытворцы. Яшчэ 32 % ідзе на ўнутраны рынак і 20 % — у іншыя краіны.

— З ТАА «Міаком СПб» мы падпісалі кантракт на пастаўку ў наступным годзе тэхнічных нітак на суму 500 мільёнаў расійскіх рублёў. Гэта прадпрыемства з'яўляецца нумарам адзін па пастаўцы геасетак і іншых матэрыялаў для ўмацавання адхонаў пры будаўніцтве дарог, — паведаміў **генеральны дырэктар ААТ «Магілёўхімвалакно» Пётр РУДНІК.** — А з ТАА «Авангард» мы на савеце дзелавога супрацоўніцтва заключылі кантракт на 5 мільярдаў расійскіх рублёў. У цэлым мы паставім у Расію прадукцыю на суму, эквівалентную 87,5 мільёна долараў.

Перспектывы

— Мне спадабалася тая абстаноўка, якая панавала на форуме, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК.** — У дэлегацыі Магілёўскай вобласці атрымалася правесці дэталёвыя перагаворы з дэпутатамі Новасібірскай, Самарскай і Ленінградскай абласцей. Гэта тыя рэгіёны, з якімі ў нас устаноўлены пэўныя адносіны. З Самарскай вобласцю ўжо падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве, мы абмеркавалі спрэчныя пытанні і спадзяёмся, што ў найбліжэйшы час атрымаецца падпісаць план мерапрыемстваў. З Новасібірскай вобласцю абмяркоўваліся перспектывы супрацоўніцтва як з Беларуссю ў цэлым, так і ў прыватнасці з Магілёўскай вобласцю. Вельмі добрыя стасункі ў нас з Краснадарскім краем, Смаленскай і Калінінградскай абласцямі. Спадабалася прапанова кіраўніка Заканадаўчага сходу Калінінградскай вобласці Марыны Аргеевай наконт стварэння ў рамках Саюзнай дзяржавы так званага фонду, сродкі якога маглі б ісці ў якасці грантаў на падтрыманне цікавых мясцовых ініцыятыў. Ідэя вельмі добрая, і хацелася б, каб яна была рэалізаваная.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Партнёрскія стасункі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Пасля пасяджэнняў секцый, у якіх будуць прымаць удзел дэлегацыі рэгіёнаў, бізнес-суполкі дзвюх краін, у Палацы Рэспублікі пройдзе вялікае пленарнае пасяджэнне. Узначаліць дэлегацыю Узбекістана на форуме першы намеснік старшыні Сената Олій Мажліса Садык Сафаеў. Менавіта супрацоўніцтва рэгіёнаў — як ключавы фактар развіцця міждзяржаўных адносін — абраны для адмеркавання ў якасці асноўнай тэмы. Мар'яна Шчоткіна ўдакладніла, што падчас пленарнага пасяджэння ўдзельнікі абмяркуюць прапановы на актуалізацыі існуючай «дарожнай карты», а таксама новыя кірункі супрацоўніцтва дзвюх краін.

— Па выніках форуму будуць падрыхтаваны даклады кіраўнікам дзяржаў, — падкрэсліла яна.

Мар'яна Шчоткіна звярнула ўвагу на мерапрыемствы, якія адбудуцца ў рамках форуму і таксама з'яўляюцца дастаткова цікавымі: так, напрыклад, будзе ўрачыста адкрыты першы ў Беларусі помнік-бюст вялікаму ўзбекскаму паэту і дзяржаўнаму дзеячу Алішэру Наваі. Таксама будзе дадзены

Фота Уладзіміра РУСЕЦКАГА.

старт дням культуры Узбекістана ў нашай краіне, пачне працаваць выстаўка-кірмаш узбекскіх тавараў, і ў працяг Першага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана пройдзе маладзёжны форму па IT-тэхналогіях, які аб'яднае маладых людзей дзвюх краін.

Что датычыцца чаканняў ад правядзення такога маштабнага мерапрыемства, віцэ-спікер Савета Рэспублікі паведаміла, што зараз у распрацоўцы знаходзяцца 15 дагавораў паміж рэгіёнамі Беларусі і Узбексітана і каля 20 камерцыйных кантрактаў.

Яна падкрэсліла знакавасць правядзення падобнага форуму, бо краіна-партнёр дастаткова далёкая, і кожны з бакоў мае свае адметныя асаблівасці, разам з тым ёсць жаданне працаваць і супрацоўнічаць разам.

Яшчэ адзін важны кірунак супрацоўніцтва, на які звярнула ўвагу Мар'яна Шчоткіна, — міжпарламенцкае супрацоўніцтва, якое дае магчымасць пашырэння перспектыў і развіцця больш цесных кантактаў на ўсіх узроўнях работы.

Наша даведка

Тавараабарот паміж краінамі летась вырас на 20 % у параўнанні з 2017-м і склаў 157 мільёнаў долараў ЗША. Беларусь выконвае пастаўкі трактароў, запчастак да іх, шасі з рухавікамі да іх, цукру і лесаматэрыялаў. З Узбекістана завозім бавоўну, вінаград, сушаную садавіну, арэхі і трыкатажныя вырабы.

З кім будзем больш плённа сябраваць?

Рыхтуюцца да падпісання дагавора аб супрацоўніцтве на рэгіянальным узроўні. Рэгіёны Узбекістана на форуме будуць прадстаўляць Андыжанская, Бухарская, Джызакская, Наманганская, Самаркандская, Харэзмская, Ферганская і Ташкенцкая вобласці.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Программы для повышения уровня жизни людей

Как развивать дальнейшее сотрудничество регионов, районов и городов Беларуси и России в рамках Союзного государства, какие совместные программы стоит принять для повышения уровня жизни людей и что станет стимулом дальнейшему развитию межрегиональных связей? Эти и другие вопросы стали темами обсуждения на заседании секции под руководством Александра ПОПКОВА, председателя Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь по региональной политике и местному самоуправлению, и Олега МЕЛЬНИЧЕНКО, председателя Комитета Совета Федерации Федерального Собрания Российской Федерации по федеративному устройству, региональной политике, местному самоуправлению и делам Севера, которая прошла в рамках VI Форума регионов России и Беларуси.

В работе секции приняли участие представители всех регионов Беларуси: губернаторы, председатели областных, Минского городского Советов депутатов, министры. Со стороны России — 15 губернаторов и глав республик и 17 руководителей представительных органов власти.

Такое пристальное внимание со стороны высших должностных лиц — свидетельство взаимной заинтересованности как Беларуси, так и России в дальнейшей экономической интеграции.

Открывая заседание, Александр Попков отметил, что с момента подписания Союзного договора реализовано 57 программ Союзного государства по разработке новых технологий и созданию инновационной продукции в таких сферах, как радиоэлектроника, микроэлектроника, оборона и безопасность, сельское хозяйство и пищевая промышленность, медицина и фармакология, социально-трудовые отношения, преодоление последствий аварии на Чернобыльской АЭС.

В настоящий момент активно развивается сотрудничество на инновационных площадках — Парка высоких технологий в Минске и Инновационного центра «Сколково» в Москве. С белорусскими партнерами работает порядка 30 компаний из Сколково, еще 70 выражают намерения о совместной работе. В свою очередь, в белорусском ПВТ работают 38 компаний с участием российского капитала.

За прошедший год белорусские организации приняли участие в 231 ярмарке в российских городах по продаже белорусской продукции, а также 400 выставках, форумах, презентациях в российских регионах. В 2018 году в Иркутской области и Республике Карелия созданы сборочные производства белорусской лесозаготовительной техники, тракторов и лифтов. Белорусские строительные организации из Витебска, Бреста, Мозыря активно работают по реализации строительных проектов в Смоленске, Курске, Калининградской области.

Таких примеров совместной работы в различных сферах можно привести немало. Однако, по словам Александра Попкова, реализация таких проектов — это сотрудничество на уровне отдельных предприятий. Говорить о претворении в жизнь комплексной программы взаимодействия регионов России и Беларуси в различных сферах пока еще рано.

— Как в Беларуси, так и в России сейчас главная задача — повышение уровня и качества жизни населения, каждого конкретного человека. Ее можно достичь путем формирования устойчивой экономики регионов. С этой целью нам необходимо совместно выработать четкие направления региональной политики, позволяющие создать условия комплексного развития производительных сил каждого региона. Нужно убрать существующие региональные различия, используя ресурсный потенциал и конкурентные преимущества территорий, — уверен он.

Александр Попков предложил разработать Союзную программу с целью развития приграничных регионов. Это Витебская, Могилевская и Гомельская области Беларуси и Смоленская, Брянская, Псковская области Российской Федерации.

Сегодня почти каждый российский регион развивает прямые торговые отношения с Беларусью. Это дает дополнительные возможности для кооперации, которые обязательно нужно использовать. Создание совместных крупных производств, промышленных кластеров — одно из наиболее перспективных направлений деятельности в рамках Союзного государства.

На заседании секции от белорусской стороны выступили также министр промышленности Павел Утюпин и министр экономики Дмитрий Крутой, председатель Могилевского облисполкома Леонид Заяц, председатели Минского городского Совета депутатов Василий Панасюк и Витебского областного Совета депутатов Владимир Терентьев, а также другие участники VI Форума регионов России и Беларуси.

Итогом работы секции стало подписание документов о сотрудничестве между регионами (муниципалитетами) Российской Федерации и Республики Беларусь. Всего в рамках подготовки проведения VI Форума было подписано 84 соглашения о сотрудничестве между регионами, учреждениями и организациями Беларуси и России.

Наталья БИТЕЛЬ.

Уладзімір КРАЎЦОЎ:

«Частку сродкаў саюзнага бюджэту варта накіраваць на рэалізацыю сумесных камунальных і сацыяльных праектаў»

Такую прапанову выказаў старшыня Гродзенскага аблвыканкама падчас Форуму рэгіёнаў у Санкт-Пецярбургу.

Кіраўнік гродзенскага рэгіёна адзначыў станоўчы вопыт супрацоўніцтва вобласці ў гэтай галіне з дзяржавамі Еўрасаюза — Польшчай і Літвой, дзе па адпаведных трансгранічных праграмах рэалізуецца больш за 60 праектаў на конкурснай аснове. Агульны кошт грантаў па іх складае 30 мільёнаў еўра. Такі эфектыўны і зразумелы інструмент супрацоўніцтва на рэгіянальным узроўні можна выкарыстаць і ў рамках праграм Саюзнай дзяржавы — напрыклад, накіраваць частку сродкаў саюзнага бюджэту на рэалізацыю інфраструктуры, камунальных і сацыяльных праектаў. Гэта можа даць значны патэнцыял для фарміравання адзінай культурнай і гуманітарнай прасторы народаў Беларусі і Расіі праз развіццё і пашырэнне міжрэгіянальных сувязяў.

Гродзенскі рэгіён пастаянна пашырае міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. На сённяшні дзень доўгатэрміновыя дагаворы падпісаны з 24 рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі. На долю расійскіх партнёраў даводзіцца 50 % тавараабароту вобласці. За 2018 год гэтая сума дасягнула каля двух мільярдаў долараў. Найбольш актыўнае супрацоўніцтва склалася з Калінінградскай, Маскоўскай абласцямі, Рэспублікай Комі. Паміж раёнамі і гарадамі Гродзенскай вобласці і РФ падпісана 37 пагадненняў.

Будаўніцтва АЭС у Астраўцы Гродзенскай вобласці — яшчэ адзін прыклад эфектыўнага міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Тут не толькі сумесна працуе больш за пяць тысяч беларускіх і расійскіх будаўнікоў, але і ўсталёўваюцца цесныя сувязі паміж гарадамі-пабрацімамі Астраўца — Сасновым борам (Ленінградская вобласць), Дзеснагорскам (Смаленская вобласць), Зарэчным (Свярдлоўская вобласць), Обнінскам (Калужская вобласць). Цяпер вядзецца падрыхтоўка да падпісання дарожнай карты доўгатэрміновага супрацоўніцтва карпарацыі «Расатам» і Гродзенскага аблвыканкама.

Уладзімір Краўцоў адзначыў унікальную магчымасць Саюзнай дзяржавы — раўнапраўе ў атрыманні ведаў у навучальных установах дзвюх дзяржаў.

Замацаваць адносіны дапамагае турызм. Штогод Гродзенскую вобласць наведвае каля 60 тысяч расійскіх турыстаў. Высокі інтарэс выклікаюць санаторыі рэгіёна. Таксама актыўна развіваецца пазнавальны, вытворчы, рэлігійны турызм. У ліку аб'ектаў, якія наведваюць расійскія турысты, — Мемарыяльны комплекс у Смаргоні, прысвечаны лініі супрацьстаяння ў Першую Сусветную вайну. Праект рэалізуецца ў рамках Саюзнай дзяржавы, першая чарга завершана ў 2014 годзе, калі адзначалася 100-годдзе пачатку вайны. Цяпер распрацаваны праект па другой, завяршальнай чарзе ў стварэнні мемарыяла. Ён праходзіць узгадненне ў органах Саюзнай дзяржавы, і гродзенскія ўлады спадзяюцца на хуткае рашэнне ў падтрымцы стварэння мемарыяльнай зоны.

> Гродзенскі рэгіён пастаянна пашырае міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. На сённяшні дзень доўгатэрміновыя дагаворы падпісаны з 24 рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

У ТЭМУ

НОВЫ ВЕКТАР ПРЫНЁМАННЯ

На форуме рэгіёнаў у Санкт-Пецярбургу падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве паміж Гродзенскай і Варонежскай абласцямі.

Фота БелТА.

Дагавор датычыцца шырокага дыяпазону дзейнасці — ад гандлёва-эканамічнага да сацыяльна-гуманітарнага. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў і губернатар Варонежскай вобласці Аляксандр Гусеў абмеркавалі будучыя крокі падчас двухбаковых перагавораў. Выяўлены агульныя сферы інтарэсаў у турызме, адукацыі, навуковай дзейнасці, інавацыйных тэхналогіях.

Напрыклад, пляцоўкай для рэалізацыі сумесных праектаў можа стаць тэхнапарк у Гродне. Першы будынак быў адкрыты летась, хутка з'явіцца яшчэ адзін. Рэзідэнты прыходзяць сюды са сваімі інавацыйнымі праектамі.

Паспяхова працуе ў Гродне і філіял рэспубліканскага Парка высокіх тэхналогій, які аб'ядноўвае каля двух дзясяткаў рэзідэнтаў і паўтары тысячы супрацоўнікаў. Сярод заказчыкаў — вядучыя сусветныя брэнды і вытворцы амаль з 90 краін. Ёсць і ўласныя праекты, якія арыентаваны ў тым ліку і на расійскі рынак.

Быў адзначаны патэнцыял у эканамічным кірунку, які пастаянна расце. Так, тавараабарот паміж Гродзенскай і Варонежскай абласцямі за мінулы год дасягнуў 33 мільёнаў долараў, тэмп росту склаў 232 %. Гродзенскі рэгіён адпраўляе ў расійскі сельскагаспадарчыя машыны, мэблю, малако, жмыхі, алей і іншыя тавары. Ёсць магчымасць пашырыць асартымент паставак. Каб гэтага дасягнуць, удзельнікі сустрэчы вырашылі стварыць рабочую групу, якая зоймецца вывучэннем рынкаў і пунктамі агульнага інтарэсу. З гэтай мэтай Уладзімір Краўцоў прапанаваў расійскаму рэгіёну прыняць удзел у міжнародным эканамічным бізнес-форуме «Еўрарэгіён «Нёман», які штогод праходзіць у Гродне і збірае некалькі сотняў удзельнікаў.

> Пляцоўкай для рэалізацыі сумесных праектаў можа стаць тэхнапарк у Гродне.

Яшчэ плануецца разгледзець магчымасць абмену вопытам у будаўніцтве анкадыспансераў. Абодва рэгіёны якраз пачынаюць ажыццяўляць гэтыя значныя праекты. У Гродне для анкацэнтра з пансіянатам і стацыянарам будзе рэканструявана гарадская бальніца, а таксама дабудаваны некалькі карпусоў. Частка сродкаў прадугледжана абласной і рэспубліканскай інвестпраграмамі.

Адным з перспектыўных кірункаў сумеснай дзейнасці можа стаць турызм. Гэтая сфера цікавіць расійскі рэгіён. І сапраўды, гродзенцам ёсць што прапанаваць: тут захаваліся сотні гістарычных помнікаў, ідзе рэканструкцыя вядомых замкаў, з'явілася нямала аб'ектаў турыстычнай інфраструктуры, распрацаваны новыя турыстычныя маршруты. Цікавымі будуць і аб'екты сусветнай спадчыны ЮНЭСКА. З чатырох беларускіх аб'ектаў тры знаходзяцца менавіта на Гродзеншчыне — гэта Белавежская пушча, Мірскі замак і геадэзічная дуга Струвэ.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

СУВЯЗІ СТАНУЦЬ БОЛЬШ УЗАЕМАВЫГАДНЫМІ

Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў на VI Форуме рэгіёнаў Расіі і Беларусі падпісаў пагадненні аб супрацоўніцтве з кіраўнікамі мясцовых органаў улады Карэліі і Пскоўшчыны.

Фота БелТА.

У прыватнасці, пагадненне разам з кіраўніком «парламента» Віцебшчыны падпісаў старшыня Заканадаўчага сходу Рэспублікі Карэлія Элісан Шандаловіч.

На погляд эканамістаў, супрацоўніцтва асабліва цесна можа быць наладжана і развівацца ў сельскагаспадарчай галіне, машынабудаванні, лесаперапрацоўцы і не толькі.

Народныя выбраннікі таксама будуць абменьвацца вопытам у сферы мясцовага самакіравання, спрыяць узаемадзеянню ў розных кірунках дзейнасці: ад умацавання правапарадку да аховы прыроды.

Кіраўнікі органаў улады згодныя ў тым, што паглыбленне сувязяў на дэпутацкім узроўні спрыяе ўзмацненню інтэграцыі ў рамках Саюзнай дзяржавы.

Міжнароднае дэпутацкае супрацоўніцтва афіцыйна замацавана і з Пскоўскім абласным сходам дэпутатаў. Кіраўнік гэтага прадстаўнічага органа ўлады Аляксандр Котаў паставіў свой подпіс пад пагадненнем разам з Уладзімірам Цярэнцьевым.

Паводле слоў Уладзіміра Цярэнцьева, што датычыцца сувязяў прыгранічных органаў прадстаўнічай улады з гэтым суб'ектам Расіі, прыкладна трэць з 45 пагадненняў, якія падпісалі за апошнія пару гадоў, — з уладай Пскоўшчыны.

І вельмі плённа вядзецца супрацоўніцтва паміж установамі культуры і адукацыі, СМІ — на абласным і рэгіянальных узроўнях. Не першы год запар ажыццяўляюцца і агульныя праекты.

Што датычыцца эканамічных сувязяў, тут ёсць нагода для гонару: калі ў першым паўгоддзі ў Віцебшчыны невялікае зніжэнне гандлёвага абароту з расійскімі рэгіёнамі, з Пскоўскай вобласцю наадварот — павялічыўся да 111 %.

У выніку падпісаных пагадненняў адкрываюцца новыя магчымасці для паскарэння развіцця партнёрства. Галоўнае, як падкрэсліў старшыня Віцебскага аблсавета, каб людзі адчулі перамены ў лепшы бок. Тыя, каму выбаршчыкі даверылі дэпутацкія мандаты, у розных кірунках спрыяюць пашырэнню міждзяржаўных сувязяў дзеля ўнёску ў эканоміку і стабільнасці стасункаў з суседзямі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Дэпутаты Міншчыны адкрытыя да супрацоўніцтва

Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Мінскім абласным Саветам дэпутатаў і Заканадаўчым сходам Свярдлоўскай вобласці падпісана падчас VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Санкт-Пецярбургу. Дакумент прадугледжвае ўзмацненне супрацоўніцтва ў сферы нарматворчай і дэпутацкай дзейнасці. Гэта мае на мэце абмен тэкстамі нарматыўных прававых актаў, іх праектаў, аналітычнымі, метадычнымі і іншымі матэрыяламі, развіццё прамых кантактаў паміж дэпутатамі, пастаяннымі камітэтамі і камісіямі, правядзенне сумесных канферэнцый, семінараў, сустрэч.

Акрамя таго, старшыня абласнога Саветаў дэпутатаў Наталля Якубіцкая выступіла з прапановай у межах наступнага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі падпісаць міжпарламенцкае пагадненне з калегамі Рэспублікі Татарстан. Старшыня Дзяржаўнага Савета Фарыд Мухаметшын падтрымаў ініцыятыву і выказаў гатоўнасць да ўмацавання парламенцкіх сувязяў з беларускімі партнёрамі.

У межах работы секцыі з дакладам таксама выступіла **старшыня Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў Наталля СУШКО.** Яна адзначыла, што горад фарміруе больш як 13 % аб'ёмаў прамысловай вытворчасці Міншчыны. Жодзіна адкрыты для расійскіх партнёраў і ўжо мае пяць дагавораў аб супрацоўніцтве. Для павышэння інвестыцыйнай прыцягальнасці два зямельныя ўчасткі, размешчаныя на тэрыторыі горада, увайшлі ў склад свабоднай эканамічнай зоны «Мінск».

— Мы гатовы выдзеліць гэтыя тэрыторыі расійскім кампаніям для стварэння буйных вытворчасцяў з даваннем падатковых ільгот, а таксама прапанаваць расійскім інвестарам свабодныя зямельныя ўчасткі для рэалізацыі сваіх праектаў, — падкрэсліла Наталля Сушко.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

Ігар ЖУК: «НЕ ТРЭБА БАЯЦЦА ПЕРАДАЧЫ ПАЎНАМОЦТВАЎ МЯСЦОВЫМ ОРГАНАМ УЛАДЫ»

З такога меркавання пачалася наша размова з кіраўніком дэпутацкага корпуса Гродзеншчыны. На думку старшыні абласнога Савета дэпутатаў Ігара Жука, многія пытанні можна вырашыць на месцы, калі для гэтага з'явяцца адпаведныя паўнамоцтвы. Людзі не будуць звяртацца ў вышэйшыя інстанцыі па хвалюючых пытаннях. Яны будуць бачыць, што мясцовая ўлада — гэта ўлада, якая вырашае іх праблемы.

— З такімі думкамі цяжка не пагадзіцца, Ігар Георгіевіч. Але ўзнікае пытанне: якім чынам гэтыя паўнамоцтвы будуць замацаваны?

— У рабоце над новай рэдакцыяй Канстытуцыі выстаўлена тэма аб дэлегаванні шэрагу паўнамоцтваў Савету Рэспублікі, парламентарыям, мясцовым органам улады. І калі будуць унесены змены ў галоўны дакумент, зменяцца і многія заканадаўчыя акты, у тым ліку і закон, які наўпрост звязаны з работай органаў мясцовага самакіравання, — Закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні.

— Ці гатовы на месцах да такіх крокаў?

— Мы бачым, што за 25 гадоў суверэннай Беларусі ў нас створана моцная выканаўчая вертыкаль улады. Цяпер наспеў час, каб заняцца дэцэнтралізацыяй і перадаць паўнамоцтвы мясцовым органам улады. Я думаю, што гэтага не трэба баяцца. Больш паўнамоцтваў, але і больш адказнасці. Мы праводзім маніторынг адносна практыкі, што трэба змяніць, у якім кірунку, дзе павялічыць паўнамоцтвы мясцовых органаў улады.

— Як дэпутаты могуць паўплываць на вырашэнне надзённых праблем сваіх выбаршыкаў?

— Многае і цяпер атрымліваецца зрабіць. Мы аналізуем гэтыя звароты і ўлічваем пры складанні бюджэта на будучы год. Такая работа пачынаецца ўжо з верасня. Усе прапановы акумулюем і пад самыя злабадзённыя ўносім фінансавую падтрымку для іх рэалізацыі. Задача дэпутатаў — актыўна абмяркоўваць бюджэт, уносіць прапановы ад сваіх выбаршчыкаў. І тут важна правільна расставіць прыярытэты: улічваць тыя пажаданні, якія часцей за ўсё выказваюць жыхары горада і сельскіх населеных пунктаў. Астатнія праблемы вырашаюцца ў чарговым парадку.

— Якія прыклады можна прывесці, калі людзі звярнуліся да дэпутатаў, а потым іх прапановы былі адлюстраваны ў бюджэце?

— Для сельскіх жыхароў актуальна праблема чыстай вады. І гэта праблема многіх раёнаў. У сельскіх населеных пунктах не хапае станцый абезжалезвання вады. Дэпутаты гэтыя праблемы выслухоўваюць, аналізуюць, і на гэтай падставе фарміруецца абласная праграма па будаўніцтве станцый абезжалезвання. Напрыклад, сёлета ў вобласці будзе пабудавана каля 45 станцый, яшчэ столькі — налета. Жыхары рэгіёна ведаюць, у якіх населеных пунктах яны будуюцца, калі гэта будзе, і зваротаў па гэтым кірунку значна менш. У нас добрыя тэмпы. Да 2025 года мы вырашым гэту праблему, як таго патрабуе кіраўнік дзяржавы.

— Якое значэнне ў рабоце дэпутатаў мае такі фактар, як празрыстасць?

— Чалавека важна праінфармаваць. Бо калі ён ведае, што і як робіцца, тады не ўзнікае пытанняў і зваротаў. Такая практыка ў нас у вобласці вядзецца. Што датычыцца фінансавага боку, на сесіях кожны квартал абмяркоўваем з дэпутацкім корпусам, як ідзе рэалізацыя бюджэту, і пры неабходнасці робім карэкціроўкі. У нас распрацавана абласная інвестыцыйная праграма, якая даступна на сайце аблвыканкама, і людзі бачаць, якія аб'екты будуць пабудаваны за яе сродкі.

— Тым не менш прамыя звароты ў вышэйшыя інстанцыі па-ранейшаму актуальныя?

— Жыццё не стаіць на месцы, значыць, і праблемы ўзнікаюць новыя. А дзесьці і старыя своечасова не вырашаюцца. Таму жыхары прыходзяць на прыём альбо тэлефануюць падчас прамых ліній. Літаральна нядаўна да мяне па тэлефоне звярнулася каля 40 жыхароў вобласці. Многія скардзіліся на работу камунальнікаў: падчас моцных дажджоў адбыліся падтапленні, якія не паспявалі хутка ліквідаваць. У сваю чаргу, такія званкі — гэта маніторынг стану водаадводаў і каналізацыі, дзе патрэбны хуткі рамонт.

Жыхары аднаго з гродзенскіх мікрараёнаў звярнуліся з просьбай вярнуць прыпынак грамадскага транспарту, які быў перанесены з-за рэканструкцыі дарогі. Жыхары дома ў цэнтры Гродна скардзяцца на шумны бар побач з іх домам... Гэтыя праблемы пасля званкоў узяты на кантроль камунальных службаў. Не ўсе пытанні можна вырашыць тэрмінова, бо часам гэта патрабуе значных фінансавых затрат. Таму задача ўлады ў такіх выпадках — расставіць правільныя акцэнты.

— Як ідзе супрацоўніцтва з выканаўчай уладай? У якой галіне асабліва важна кансалідаваць намаганні?

— Апошнім часам агульныя намаганні накіроўваем на добраўпарадкаванне, навядзенне парадку на зямлі. Усе пытанні вырашаюцца разам на сумесных пасяджэннях выканаўчага камітэта, сесіях, прэзідыумах. Так, нядаўна мы правялі сумеснае пасяджэнне па праблемах ЖКГ вобласці. Гэта тая сфера, якая больш за ўсё выклікае заўвагі ў насельніцтва. Таму гэта актуальна, і мы шукаем шляхі эфектыўнай работы ЖКГ, расстаўлены стратэгічныя і тактычныя кірункі, якія забяспечвалі б якасныя паслугі. Не сакрэт, што менавіта па стане ЖКГ людзі даюць ацэнку мясцовай уладзе.

Фота БелТА.

Цяпер мы разам з выканаўчым камітэтам рыхтуем маштабнае мерапрыемства — сумеснае пасяджэнне па павышэнні эфектыўнасці будаўнічай галіны Гродзеншчыны. Разгледзім, як выконваюцца патрабаванні дырэктывы № 8 аб прыярытэтах развіцця будаўнічай галіны. Гэта развіты комплекс у рэгіёне. У вобласці рэалізуецца маштабны праект — будаўніцтва Беларускай АЭС, многа аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры — стадыёны, школы, медыцынскія ўстановы. Узводзіцца жыллё. Па выніках пасяджэння будуць выпрацаваны рашэнні і па кадравых праблемах. Ідзе адток будаўнікоў, у тым ліку і за мяжу. Дэпутаты выступяць са сваімі прапановамі.

> Мы бачым, што за 25 гадоў суверэннай Беларусі ў нас створана моцная выканаўчая вертыкаль улады. Цяпер наспеў час, каб заняцца дэцэнтралізацыяй і перадаць паўнамоцтвы мясцовым органам улады. Я думаю, што гэтага не трэба баяцца. Больш паўнамоцтваў, але і больш адказнасці.

— Ці задавальняе Савет дэпутатаў стан прадпрымальніцтва ў рэгіёне? Як дэпутацкі корпус можа спрыяць развіццю гэтай важнай у эканоміцы структуры?

— Пры Гродзенскім аблвыканкаме і гар- і райвыканкамах створаны грамадска-кансультатыўныя саветы па развіцці прадпрымальніцтва, у склад якіх уваходзіць каля 80 % прадстаўнікоў бізнесу, таксама членамі такіх саветаў з'яўляюцца дэпутаты мясцовых Саветаў усіх узроўняў. На тэрыторыі вобласці створана добрая дыялогавая пляцоўка паміж органамі ўлады і бізнесу. Дарэчы, у галіне малога і сярэдняга бізнесу ў 2018 годзе створана 5884 новых працоўных месцаў. Прынцыпова новым фарматам работы з суб'ектамі малога і сярэдняга бізнесу стала «Адкрытая прыёмная для бізнесу»: выязныя мерапрыемствы ўжо прайшлі ў Дзятлаве і Шчучыне, а да канца года пройдуць ва ўсіх рэгіёнах вобласці. На сустрэчы з прадпрымальнікамі выязджаюць каля 20 кіраўнікоў і спецыялістаў розных інстанцый, дзяржаўных органаў і структур — на месцы бачаць тое, што хвалюе бізнес, і дапамагаюць аператыўна вырашыць усе пытанні. У рамках рэалізацыі нормаў Дэкрэта № 7 прыняты шэраг заканадаўчых актаў, у тым ліку якія спрашчаюць прадпрымальніцкую дзейнасць. Тэмп росту колькасці фізічных асоб у рамках існуючага заканадаўства склаў больш за 170 %.

Цяпер многія імкнуцца знайсці сябе ў гэтым кірунку, і мы павінны іх падтрымаць. Для гэтага праводзім сустрэчы, ёсць камісія, якая працуе з прадпрымальнікамі. З імі вядзецца шчырая і зацікаўленая размова па ўсіх праблемах, выслухоўваем іх заўвагі, аналізуем, уносім свае прапановы ў структуры ўлады, Адміністрацыю Прэзідэнта. І зрухі ёсць. Тут можна прывесці прыклад Шчучынскага раёна, дзе ўлады працуюць эфектыўна, у гаспадарчы абарот уцягваюцца пустуючыя аб'екты, у тым ліку ваенныя гаражы, былыя авіячасці. На адной з такіх пляцовак нядаўна запрацавала буйная фабрыка грыбоў, створаны аб'екты турызму. Плануем чарговую сесію правесці на базе Шчучынскага раёна, дзе будуць абмеркаваны якраз праблемы прадпрымальніцтва.

— Я ведаю, што гродзенскія дэпутаты наладжваюць міжпарламенцкія сувязі са сваімі замежнымі калегамі. Якія існуюць дагаворы і што можна пераняць у сваіх сяброў з-за мяжы?

— Савет дэпутатаў прымае ўдзел у беларуска-расійскіх форумах. Так, на пятым форуме, які летась прайшоў у Магілёве, падпісаны пагадненні паміж Гродзенскім абласным Саветам дэпутатаў і Калінінградскай абласной Думай. Падпісаны камерцыйныя кантракты на 100 мільёнаў долараў з расійскімі рэгіёнамі. Літаральна нядаўна я быў у Калінінградзе на форуме рэгіёнаў — партнёраў Калінінградскай вобласці. На ім было адзначана, як праз парламентарыяў, праз народную дыпламатыю, развіваюцца міжрэгіянальныя сувязі, а гэта і эканоміка, і культура, і спорт. Зусім нядаўна ў Санкт-Пецярбургу адбыўся VI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, у рамках якога падпісаны пагадненні аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве, дагаворы аб устанаўленні пабрацімскіх сувязяў паміж рэгіёнамі Гродзенскай вобласці і суб'ектамі Расійскай Федэрацыі. Таксама нам цікавы еўрапейскі вопыт. Мы прымалі ўдзел у мерапрыемствах, якія праводзіць Савет Рэспублікі Беларусі з удзелам партнёраў Савета Еўропы, дзе вывучылі вопыт мясцовага самакіравання. Гэта Польшча, Балгарыя, Украіна. Мы прымаем удзел у трансгранічных праектах. Разам з тым замежным партнёрам цікава даведацца пра наш вопыт, нам ёсць чым падзяліцца, што паказаць...

— Напрыклад, як вядзецца работа па ўвекавечванні памяці аб ахвярах вайны... Відавочна, што дэпутацкі корпус у гэтай рабоце знаходзіцца сярод арганізатараў.

— Напярэдадні святкавання 75-й гадавіны вызвалення Беларусі мы правялі пашыранае пасяджэнне прэзідыума абласнога Савета з грамадскімі арганізацыямі, дзе падвялі некаторыя вынікі выканання праграмы 2016—2020 гадоў па ўвекавечванні памяці аб загінулых у Першай і Другой сусветных войнах.

У вобласці арганізавана работа па падтрыманні парадку на месцах мемарыялаў, у нас больш за 700 такіх месцаў, за кожным замацаваны шэфы — валанцёры, працоўныя калектывы, БРСМ. Вызначылі далейшыя крокі ў рабоце. Падчас пасяджэння прагучала прапанова стварыць мемарыял на месцы шталага, дзе загінулі дзясяткі тысяч ваеннапалонных. Цяпер там вядзецца пошукавая работа, высвятляюцца імёны загінулых. Дэпутаты абласавета ідэю мемарыяла падтрымалі, зараз будзем вырашаць, як гэта ўсё рэалізаваць.

— Вернемся да нашых злабадзённых пытанняў, такіх як занятасць насельніцтва. Для дэпутатаў гэта работа і адказная, і даволі клапатлівая, бо закранае лёс чалавека, яго жыццёвыя праблемы. Як працуюць камісіі па садзейнічанні занятасці ў Гродзенскім рэгіёне?

— Такія камісіі ўзначальваюць старшыні райсаветаў, у склад іх уваходзяць у тым ліку дэпутаты розных узроўняў. Гэта аўтарытэтны орган, які не толькі займаецца маніторынгам занятасці насельніцтва, але і дапамагае людзям у працаўладкаванні. Бываюць выпадкі, калі чалавек трапляе ў цяжкае жыццёвае становішча, і задача дэпутата — своечасова на гэта адрэагаваць. На камісіі прымаюцца адказныя рашэнні па вызваленні жыхароў ад павышаных тарыфаў на паслугі ЖКГ у выпадку знаходжання ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Камісія гэта ацэньвае, дэпутаты наведваюць гэтых людзей, уносяць свае прапановы. Без дэпутатаў зрабіць гэта было б складана.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Тэлесеткі

ХТО НАСТУПНЫ НА «ЕЎРАБАЧАННЕ»?

У Беларусі пачаўся нацыянальны адбор на міжнародны дзіцячы конкурс

Арганізуе і праводзіць адборачны этап Белтэлерадыёкампанія. Заяўкі ад юных артыстаў (ва ўзросце ад 9 да 14 гадоў на час правядзення конкурсу) альбо дзіцячага калектыву, у складзе якога да шасці чалавек, прымаюцца выключна ў электронным выглядзе — праз сайт www.tvr.by — да 15 жніўня.

Патрабаванні да конкурсных песень засталіся ранейшыя: прымаюцца кампазіцыі на беларускай або рускай мове з уключэннем не больш як 40 % тэксту на замежнай мове, працягласцю да трох хвілін, а галоўнае — каб яны не былі публічна выкананыя альбо камерцыйна рэалізаваныя да 1 мая 2019 года.

Каб затрымаць у пасёлку турыстаў, улады ідуць насустрач прадпрымальніцкім ініцыятывам. Напрыклад, уладальнікам гасцінічнага бізнесу яны гатовы даць зямельны ўчастак для будаўніцтва спа-комплексу з басейнам, саўнай, касметалагічнымі працэдурамі. Дарэчы, хутка пачнецца рэканструкцыя так званай купецкай сінагогі пад гасцініцу.

Цяпер у гасцінічным фондзе прадпрымальнікаў каля 40 нумароў, у тым ліку і люкс, кошт якога дасягае 200 рублёў за суткі. Але гэта, вядома, не адзіны гатэль у пасёлку. Ёсць тут гасцініца камунальнай уласнасці, а таксама ў Мірскім замку.

Трэба сказаць, што замак захапляе сваім велічным выглядам. Але мала хто ведае, што ў 1942 годзе тут некалькі месяцаў было размешчана яўрэйскае гета.

Мы працягваем наша падарожжа па былым яўрэйскім квартале. І тут таксама ёсць чым уразіцца. Насупраць былых сінагог месціцца былая карчма. Праўда, яе функцыя даўно страчана, а гадоў пятнаццаць таму будынак купіў аматар старажытнасці Віктар Сакель і стварыў прыватны музей яўрэйскай культуры.

Як расказаў сам гаспадар, усе экспанаты мясцовыя, многія знойдзены пры раскопках у замку яшчэ да яго рэстаўрацыі, многія трапілі на вочы пры пракладцы інжынерных сетак. Тут знаходзіцца вялікі клад старажытных манет. Іх Віктар знайшоў, калі заліваў фундамент.

Уражваюць арыгіналы дакументаў канца XIX стагоддзя. Напрыклад, царскі ўказ 1892 года аб дапамозе пагарэльцам Міра. Як вядома, пасёлак некалькі разоў моцна выгараў, і захаваліся нават спісы жыхароў, каму і колькі было ахвяравана пасля пажару.

Смутак выклікаюць рэчы, якія засталіся пасля арыштаў яўрэяў. Прадметы побыту, посуд, кнігі, адзенне — многае захавалася толькі таму, што было закапана альбо схавана. Напрыклад, скрутак палатна праляжаў у зямлі паўстагоддзя, і, што цікава, цяпер у добрым стане. Гадзіннік ідзе больш за сто гадоў, ды яшчэ з боем. А патэфонаў тут некалькі. І некаторыя працуюць, пласцінкі 30-х гадоў гучаць незабыўна. Дарэчы, у музей трапілі і некаторыя рэлігійныя прадметы з куфра рабіна, які знайшлі падчас рэканструкцыі рэстарана яго ўласнікі.

Музей — не адзіны аб'ект Віктара Сакеля. Ён купіў яшчэ адзін дом побач і стварыў аграсядзібу. Цяпер у яго таксама свой невялікі, але цікавы комплекс.

Нядаўна мясцовыя ўлады распачалі супрацоўніцтва з грамадскімі яўрэйскімі абшчынамі. Так, міжнародны студэнцкі цэнтр зацікавіўся тутэйшымі старажытнымі могілкамі. У Мір з'ехаліся студэнты-валанцёры з многіх краін, каб правесці дакладную інвентарызацыю. Цяпер гэта тэрыторыя на балансе сельскага Савета, але тут можна стварыць сапраўдны турыстычны аб'ект.

— Яўрэйскія могілкі даволі вялікія, але мы нічога пра іх не ведаем, бо не можам прачытаць надпісы, і нам дапамогуць валанцёры. Пасля таго як будзе ўсё задакументавана, можна падаць заяўку на ўключэнне могілак у спісы помнікаў гісторыка-мемарыяльнай каштоўнасці. І гэта апраўдана, бо могілкі старажытныя, заснаваны можа дзесьці ў XVII стагоддзі, а апошнія пахаванні тут адбываліся ў 30-х гадах мінулага стагоддзя, — расказаў Руслан Абрамчык.

Ёсць планы і на наступны год. Саюз яўрэйскіх абшчын мае намер прафінансаваць рэканструкцыю і замену мемарыяльных знакаў на месцах масавых расстрэлаў. І хоць сельскія Саветы Карэліцкага раёна даглядаюць тэрыторыю, многія знакі патрабуюць аднаўлення, бо былі ўстаноўлены яшчэ ў 60-я.

Цяпер былы яўрэйскі квартал мае іншы воблік, сучасны і турыстычны. Па гэтым шляху гарадскі пасёлак будзе ісці і далей. Мір — адзін з 16 пасёлкаў, якія вылучаны ў пілотны праект дзяржаўнай праграмы па добраўпарадкаванні. І многае ўжо зроблена, адзначыў Руслан Абрамчык. Прыведзены ў належны стан дарогі, сістэма водазабеспячэння, сацыяльныя аб'екты. Мірскі замак — адзін з чатырох аб'ектаў Беларусі, якія ўключаны ў спіс ЮНЭСКА, і вельмі папулярны сярод турыстаў. Многія з іх любяць спыняцца ў гасцініцах, якія абсталяваны ў гістарычных будынках.

Фота аўтара.

Матэрыялы падрыхтавала Маргарыта УШКЕВІЧ.

ПРАБЛЕМА І РАШЭННЕ

ЁСЦЬ НАРМАТЫВЫ, АЛЕ ЗАСТАЮЦЦА БАР'ЕРЫ

Людзі з абмежаванымі магчымасцямі не хочуць прасіць дапамогі ў навакольных

І не таму, што гэту дапамогу не атрымаюць. Наадварот. Многія імкнуцца дапамагчы ў такіх сітуацыях. Але самі інваліды лічаць, што такую магчымасць павінна забяспечваць дзяржава.

Нездарма Беларусь у 2016 годзе ратыфікавала Канвенцыю па правах інвалідаў, якая гарантуе роўныя правы для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Як такую ўстаноўку вырашаюць дэпутаты і мясцовыя ўлады Гродна?

Каб адправіцца ў паездку...

Алена Бельская любіць куды-небудзь паехаць, хоць і перасоўваецца на інваліднай калясцы. Часам вандроўкі пакідаюць не самае лепшае ўражанне, асабліва гэта датычыцца дальніх паездак. Таму усё, што палягчае такія вандроўкі, Алена сустракае радасна. А нядаўна яна даведалася пра новую магчымасць, якую даюць гродзенскія чыгуначнікі. Аказваецца, трапіць у вагон можна на спецыяльным пад'ёмніку. Ды і вагон таксама спецыяльны — у купэ ўсё прадугледжана для камфортнай паездкі чалавека з інваліднасцю.

Пакуль Алена не мела магчымасці праехаць у такім вагоне, але змагла ацаніць зручнасць пад'ему ў яго. І такіх спецыяльных вагонаў на станцыі «Гродна» амаль 30. Адзін з іх у цягніку, які ідзе ў Маскву.

— Людзям у інвалідных калясках дапамогуць з пад'ёмнікам работнікі вакзала альбо брыгада цягніка, а інфармацыя пра паездку перадаецца як на станцыю адпраўлення, так і ў пункт прыбыцця незалежна ад таго, у Беларусі гэты населены пункт альбо за мяжой, — патлумачыла **начальнік вакзала Валянціна МІКУЦКАЯ.**

Праўда, ёсць даволі важны нюанс. Для арганізацыі паездкі неабходна зрабіць заяўку не менш чым за пяць сутак да рэйса. У іншым выпадку цяжка гарантавана трапіць у такое спецыяльнае купэ. А попыт ёсць: людзі ў інвалідных калясках ездзяць на спаборніцтвы, розныя мерапрыемствы, сустрэчы. Напрыклад, цяпер ім намнога зручней дабрацца да Мінска. У цягніку ёсць адмысловыя месцы для інвалідаў, таму не абавязкова заказваць спецыяльнае купэ, і час адпраўлення зранку з Гродна даволі зручны.

На самім вакзале, паведаміла Валянціна Мікуцкая, безбар'ернае асяроддзе забяспечваюць дзевяць пунктаў. Для выкліку супрацоўніка вакзала можна скарыстацца спецыяльным радыёпультам. Перад уваходам у вакзал ёсць ліфт.

У паліклініку і на боўлінг

Паліклінікі і аптэкі людзі ў інвалідных крэслах наведваюць часцей за ўсё. «Безбар'ерна» дабрацца да ўрача робіцца больш зручна. Па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама, члена Савета Рэспублікі Алены КРАТКОВАЙ,** работа ідзе над тым, каб усе медыцынскія ўстановы вобласці былі абсталяваны пандусамі, ліфтамі, спецыяльнымі санітарнымі вузламі. Гэтыя пытанні абавязкова ўлічваюцца пры рэканструкцыі і мадэрнізацыі бальніц і паліклінік.

З такім падыходам працуюць многія ўстановы культуры. Узорным у гэтым плане можна лічыць культурна-забаўляльны комплекс «Галактыка».

— Пакуль яшчэ рэдкасць, калі прыходзіць сам інвалід, — падкрэсліў **начальнік аддзела культуры Гродзенскага гарвыканкама Дзмітрый ВІЛЬЧЫК.** — У асноўным мы працуем з групамі. Трапіць у культурны цэнтр для чалавека ў інваліднай калясцы нескладана. Уваход абсталяваны пандусам, працуе ліфт, у боўлінгу ёсць спецыяльная дарожка з борцікамі. Пры неабходнасці, напрыклад, загрузкі ў аўтамабіль карыстаемся тэлескапічнымі пандусамі.

Юлія, якая працуе ў цэнтры сацыяльнай рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў, расказала, што яна са сваёй падапечнай была ў цэнтры некалькі разоў. Галоўнае, каб было жаданне адкрываць нешта новае, тады і перашкод будзе менш, лічыць яна. Хоць даводзіцца браць у разлік кошт забаў — далёка не кожнаму інваліду такія траты па кішэні.

З дапамогай дэпутата і камунальнікаў

Такі праект сёлета рэалізаваны ў гістарычным цэнтры горада. У кватэры, дзе жыве сям'я інвалідаў-калясачнікаў, па хадайніцтве дэпутата гарсавета ўстаноўлены пад'ёмнік. Гаспадар кватэры Васіль Галась неаднаразова звяртаўся ў розныя інстанцыі, пакуль за справу не ўзяўся дэпутат Сяргей Каляда. Яму ўдалося падключыць камунальныя службы, і справа зрушылася з месца.

Пад'ёмную платформу ўсталявалі з выхадам на балкон, бо сям'я пражывае на першым паверсе. І хоць пад'ёмнік нікому не перашкаджае, яго ўстаноўка заняла даволі працяглы час. Амаль год спатрэбіўся на ўзгадненне дакументаў у Міністэрстве архітэктуры і горадабудаўніцтва.

Паралельна вялася работа з жыхарамі пад'езда, якія павінны даць згоду на ўстаноўку аўтаномнага пад'ёмніка і далучэнне яго да агульнай сістэмы энергазабеспячэння. У цэлым магутнасць яго невялікая — 0,55 кілават-гадзін. Па словах **намесніка генеральнага дырэктара гарадскога ЖКГ Сяргея СЯМАШКІ,** праз вялікую колькасць узгадненняў такія пад'ёмнікі ў старым жылым фондзе паставіць вельмі складана. Перашкаджае і непрыстасаванасць саміх будынкаў. Найбольш даступны варыянт, па яго словах, гэта адкідныя пандусы. Іх установлена пакуль шэсць, яшчэ столькі ж — тэлескапічных. У горадзе пяць аб'ектаў з пад'ёмнымі платформамі.

Сёлетняя праграма па безбар'ерным асяроддзі ў горадзе выканана, паведаміў Сяргей Сямашка, але разглядаецца пытанне аб выдзяленні дадатковых сродкаў яшчэ на 14 аб'ектаў. Усяго ў органы мясцовай улады пададзена 50 заявак па стварэнні безбар'ернага асяроддзя. Больш за ўсё праблем датычыцца нават жылой забудовы старой часткі горада. Да таго ж многія прапановы спецыялістаў вельмі доўга ўзгадняюцца ў вышэйшых інстанцыях — гэта робіцца перашкодай у пошуку аптымальнага варыянта.

Нормы нахілу вызначаны

Сучасныя жылыя забудовы ўзводзяцца з улікам новых безбар'ерных нарматываў. Напрыклад, у шматпавярховіку мікрараёна Фолюш пад'ёмнік устаноўлены без усялякіх заявак. Гэта звязана з тым, што патрабаванні да безбар'ернага асяроддзя ў жылым фондзе значна змяніліся. Такая работа пачалася ў 2010 годзе, калі ў праектах сталі прапісвацца нормы па пандусах. Далей — больш. Ужо летась праекты прадугледжвалі пад'ёмную платформу, калі вышыня пандуса перавышае дапушчальную норму ў 0,6 метра. Так, у Гродне сёлета з'явіліся тры шматпавярховікі з пад'ёмнымі платформамі. Па такім прынцыпе цяпер ідзе забудова новага гродзенскага мікрараёна Грандзічы-2.

— Далёка не факт, што хоць у адной з кватэр новабудоўлі будзе жыць чалавек з абмежаванымі магчымасцямі, — патлумачыла **намеснік упраўлення архітэктуры і горадабудавання гарвыканкама Вольга БАРЭЙКА.** — Але з нядаўняга часу гаворка ідзе пра стварэнне безбар'ернага асяроддзя не толькі для людзей з інваліднасцю, але і ў цэлым для фізічна аслабленых жыхароў. Да гэтай катэгорыі можна аднесці сталых, часова непрацаздольных, цяжарных жанчын. Пад'ёмная платформа будзе зручная таксама для маці з дзіцячымі каляскамі, для малых дзяцей з роварамі.

Нарматыўная база датычыцца і дваровай тэрыторыі. Не павінна быць перападу паміж тратуарам і праезнай часткай каля пад'ездаў. Вызначаны нахіл прыступак і поручняў. Укладваецца тактыльная плітка. Вырашаецца пытанне аб праектаванні некалькіх кватэр для інвалідаў-калясачнікаў.

Новыя нормы безбар'ернага асяроддзя закладзены ў поўным аб'ёме і ў генеральны план Гродна, падрыхтаваны для зацвярджэння кіраўніку дзяржавы, падкрэсліла Вольга Барэйка.

❍ НАША ДАВЕДКА

У Гродзенскай вобласці жыве каля 63 тысяч чалавек з абмежаванымі магчымасцямі, з іх амаль 18 тысяч — у Гродне. У СШ № 38 функцыянуе пяць інтэграваных класаў для дзяцей з ДЦП.

Бесперапыннае асяроддзе? Праблема...

У Гродне вызначаны галоўны кірунак — каб безбар'ернае асяроддзе не перарывалася. Чалавек у інваліднай калясцы павінен ад дзвярэй кватэры да месца прызначэння дабірацца без асаблівых перашкод. Па словах **старшыні Гродзенскага аб'яднання інвалідаў-калясачнікаў Сяргея ФЕШЧАНКІ,** для многіх праблемы пачынаюцца ўжо з парога. Адкідныя пандусы, якімі абсталяваны многія пад'езды, установлены пад такім вуглом, як і лесвічны пралёт. А вугал нахілу бывае даволі вялікі, і пераадолець яго самастойна немагчыма.

Яшчэ адна праблема, якую агучыла **намеснік старшыні гарвыканкама Зоя КУЛЕША,** датычыцца сацыяльнага таксі. Вядома, добра, што ў горадзе працуе такі запатрабаваны транспарт, які можа падвезці чалавека з абмежаванымі магчымасцямі ў любы пункт горада. Напрыклад, за паўгода выканана 650 заявак ад 130 жыхароў. На гэтыя мэты выдаткавана 17 тысяч рублёў, столькі будзе асвоена ў другім паўгоддзі. Сацыяльнае таксі абсталявана пад'ёмнікам. Вось толькі скарыстацца сацыяльным таксі ўдаецца амаль праз тыдзень з моманту заяўкі. Калі казаць пра даступнасць такой паслугі, ёсць неабходнасць у набыцці яшчэ як мінімум двух аўтамабіляў, падкрэсліла Зоя Кулеша.

Далёка не ўсе паркоўкі абсталяваны месцамі для людзей у інвалідных калясках. Напрыклад, яны адсутнічаюць на стаянцы каля чыгуначнага вакзала. У многіх аб'ектах, у тым ліку паліклініках, бальніцах, не прадугледжаны спецыяльныя санітарна-гігіенічныя вузлы.

— Канешне, сённяшні стан адрозніваецца ад таго, што было яшчэ некалькі гадоў таму, многае зроблена, асабліва ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі, — адзначыў Сяргей Фешчанка. — Безбар'ернае асяроддзе ў горадзе прыкметнае — курсіруе нізкапольны транспарт, ёсць спецыяльныя электронныя табло, тактыльныя разметкі... Хацелася б паскорыць вырашэнне праблемы высокіх бардзюраў, што важна для чалавека ў інваліднай калясцы.

Пры гэтым кіраўнік таварыства інвалідаў заклікае не гнацца за колькасцю, а звярнуць больш увагі на якасць работы. Зрабіць менш, але дасканала.

Па словах Зоі Кулешы, у горадзе 63 % аб'ектаў часткова ці поўнасцю прыстасаваны да безбар'ернага асяроддзя. Многія элементы зроблены пасля звароту грамадзян, і людзі актыўна ўносяць заяўкі ў спецыяльную камісію. Сумесна з ДАІ адсочваюцца правілы паркоўкі. Штогод з гарадскога бюджэту выдзяляецца 50 тысяч рублёў на праграму безбар'ернага асяроддзя. Безумоўна, гэтага недастаткова, таму многія ўстановы самі ствараюць даступнасць для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, напрыклад медыцынскія, сацыяльныя, гандлёвыя аб'екты.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Віктар ЛІСКОВІЧ, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама, дэпутат абласнога Савета дэпутатаў:

— У стварэнні безбар'ернага асяроддзя важна рухацца крок за крокам, не спыняцца ні на хвіліну. Як гэта зрабіць? Трэба браць канкрэтны аб'ект і дабівацца там даступнага асяроддзя. Узорнымі ў гэтым кірунку павінны стаць нашы знакавыя аб'екты, якія будуць здавацца ў хуткім часе, — новая бальніца ў Астраўцы, універсітэцкая клініка і анкалагічны цэнтр. Да прыёмкі аб'екта плануем далучаць непасрэдна тых, хто мае інваліднасць. Наша задача — стварыць роўныя магчымасці ўсім нашым жыхарам, не рабіць ласку, а разумець, што гэта нармальнае жыццё.

ЗРАБІ САМ!

Каб жыць прыгожа, трэба самім паклапаціцца

Угэтым кірунку вось ужо пяць гадоў працуе Наталля САСІМ — кіраўнік аднаго з гродзенскіх камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КТГС). Неяк яна завітала ў мясцовы ЖЭС, каб вырашыць набалелую праблему. І зразумела, што дапамагчы і сабе і іншым можна ўласнымі намаганнямі.

Нядаўна падводзіліся вынікі работы органаў мясцовага самакіравання за мінулы год. У ліку пераможцаў — камітэт, які ўзначальвае Наталля Сасім.

Дрэвы пасадзіць і выратаваць

Каб было зразумела, пра што пойдзе гаворка, варта прыгадаць, чым займаюцца камітэты грамадскага самакіравання. Па-першае, грамадскія арганізацыі ствараюцца пры ЖЭСах і павінны дапамагаць камунальнай службе ў вырашэнні адпаведных пытанняў жылога сектара — напрыклад, падтрымліваць чысціню і парадак, паляпшаць стан жылых дамоў і прыдамавых тэрыторый. Па-другое, КТГС працуюць і па сацыяльнай лініі — арганізуюць падтрымку сем'яў, дзе не заўсёды пануе лад ды згода, сталых людзей, ладзяць дабрачынныя акцыі, арганізуюць святы мікрараёнаў...

Пакуль Наталля расказвае пра свае грамадскія абавязкі, ходзім па двары яе мікрараёна. Яна паказвае вынікі апошняга суботніка, на які сабраліся жыхары навакольных дамоў. Вось адноўленыя дзіцячыя пляцоўкі, вось пасадзілі дрэвы, у тым ліку садовыя. Пабеленыя бардзюры. Жыхары не толькі самі выходзяць, але і свае матэрыялы, інструменты і фарбу нясуць. Не стаіць убаку і ЖЭС № 11, дае неабходны інвентар, закупляе тую ж фарбу.

— Так пайшло, што людзі прывыклі да калектыўнай працы і хочуць падтрымліваць парадак на сваіх дварах, — кажа Наталля. — Таму многія пачынаюць самі тэлефанаваць і цікавіцца: калі выходзім? Я зразумела, як важна аб'яднаць людзей. Бо ёсць шмат пасіўных, якія пры добрай арганізацыі таксама ўключаюцца ў работу.

Неяк заўважылі, што адной лаўкі каля пад'езда 12-павярховіка недастаткова. Звярнуліся праз Наталлю да дэпутата сваёй акругі. Ён паспрыяў таму, каб побач з'явілася яшчэ адна. Цяпер ёсць дзе абмеркаваць планы ў больш шырокім фармаце. Па словах Наталлі, ім пашанцавала з дэпутатамі. І Уладзімір Белавусаў, і Сняжана Куратчык заўсёды прыходзяць на акцыі і актыўна ўдзельнічаюць у іх. Напрыклад, дэпутат Белавусаў прывёз больш за дзясятак туй у кадках і сам удзельнічаў у пасадцы. Непадалёк ад туй высаджана алея клёнікаў.

Наталля адразу заўважае, як ратавалі дрэвы падчас чэрвеньскай спякоты. Рэгулярна вялася іх паліўка, прычым па ўсёй тэрыторыі ЖЭСа. Нават шлангі для гэтай мэты закупілі. Жыхары прапануюць свае паслугі. Нядаўна мясцовы жыхар, работнік МНС, скасіў газоны сваёй газонакасілкай. Жанчыны высаджваюць кветкі, робяць клумбы. Па іх просьбе Наталля шукала саджанцы язміну. Урэшце знайшла, і жанчыны іх пасадзілі каля дамоў.

Гродна, на яе думку, даволі зялёны горад. Вядома, многа старых дрэў спілена, але замест іх пасаджаны маладыя дрэўцы. Горад прырастае мікрараёнамі, якія таксама трэба актыўна азеляняць. Вялікую высадку зрабілі за апошнія некалькі гадоў. Наталля ўдзельнічала ў пасадках мікрараёна Дзевятоўка. Высадзілі мірт — сімвал міру і цішыні.

Ёсць спрэчкі, але рамонт ідзе

Самая злабадзённая праблема, бадай што, рамонт пад'ездаў. Многія жыхары, асабліва камунальнага фонду, прывыклі чакаць, пакуль ім зробяць рамонт. Але такі падыход — у мінулым. Згодна з новым Жыллёвым кодэксам, усе пад'езды павінны рамантаваць і аднаўляць самі жыхары. І з гэтым тут няма вялікіх праблем. Жыхары самі выступаюць ініцыятарамі аднаўлення. Напрыклад, у доме № 12 частка лесвічных клетак адрамантавана. Як гэта адбываецца?

— Жыхары некалькіх кватэр збіраюцца, каб дамовіцца пра рамонт. Клічуць мяне, — тлумачыць Наталля. — Мая задача — арганізаваць, падказаць, дапамагчы. Я пытаю: чаго вы хочаце, які рамонт вам патрэбны? Вядома, у людзей розны дастатак. У рэшце рэшт знаходзяць сваё рашэнне. Тынкоўка, плітка, работы майстра — як дамовяцца. Адзін паверх купляе даражэйшыя матэрыялы, іншы — танейшыя. Прыдумваюць самі дызайн і ажыццяўляюць. Кожны паверх па-свойму цікавы, але галоўнае — тут парадак і чысціня. Яшчэ жыхары за свой кошт замянілі дзверы ліфта.

Наталля паказвае паверх, дзе зроблены рамонт, і тыя, дзе работы толькі пачаліся. Каля сцяны высіцца складзеная плітка, частка падлогі на калідоры пакладзена. Гэта робяць самі жыхары. Вядома, можна наняць і майстроў, але тут палічылі, што справяцца самастойна.

— Вядома, не ўсё праходзіць гладка, бывае, што сходы пераходзяць у сваркі, пачынаюць спіхваць абавязкі на іншых, рамонт зацягваецца, бо суседзі не могуць дамовіцца, — расказвае яна эмацыянальна. — У такім выпадку я пытаюся: а што вы зрабілі, каб палепшыць свае асяроддзе? Крычаць кожны можа. Слова за слова, і вось сціхае сварка, а потым і чай ідуць разам піць.

Заходзім у пад'езд дома 8г, дзе жыхары ўмеюць не толькі спакойна дамовіцца, але і па-дызайнерску афарміць свой пад'езд. Адразу на ўваходзе сустракае шыкоўная ляпніна пастэльных таноў, далей — цэлае пано ляпніны старажытнага Гродна з падсветкай. Усё зроблена за кошт саміх жыхароў. На думку Наталлі, важна растлумачыць, што гэта ўсё-маёмасць саміх жыхароў і яе трэба захоўваць у належным стане.

Сваю ролю адыграла першая ініцыятыва. І калі жыхары іншых дамоў убачылі, як можна адрамантаваць свой пад'езд, яны таксама ўзяліся за справу. Канешне, самы папулярны варыянт — пафарбавалі і пабялілі, але многія сталі рамантаваць з размахам, дызайнерскім падыходам. Кожны паверх у такім доме выглядае па-свойму. На адным пакладзена рэльефная плітка, на другім — глянцавая.

— У такіх выпадках я кажу: калі ты сам зробіш, будзеш жыць лепш. І мы пакрыху прывучаем людзей да гэтага. Напрыклад, зрабілі не проста паркоўку, а экалагічную, са спецыяльнай плиткай. І многія выйшлі паўдзельнічаць у яе абсталяванні.

Члены камітэта грамадскага самакіравання, дэпутаты, савет ветэранаў, ЖЭС, мясцовы ўчастковы, жаночы савет — многія пытанні абмяркоўваюцца разам. Звяртаецца ўвага на сацыяльны аспект, падтрымку малазабяспечаных сем'яў. Прадстаўнікі камітэта нядаўна вазілі дзяцей з сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, на базу адпачынку «Прывал».

Наталля і сама маці траіх дзяцей. Яны заўсёды выходзяць з ёй на масавыя акцыі, напрыклад пабяліць дрэвы ці прыбраць смецце на беразе Нёмана. Дапамагаюць і ў іншых лакальных справах, у тым ліку наводзяць парадак у сваім пад'ездзе.

> Я зразумела, як важна аб'яднаць людзей. Бо ёсць шмат пасіўных, якія пры добрай арганізацыі таксама ўключаюцца ў работу.

Але не толькі двары і рамонты клапоцяць актывістку. Яна дапамагае і ў цяжкіх жыццёвых становішчах. Не так даўно прадухіліла спробу суіцыду аднаго хлопца з суседняга дома, які пагражаў кінуцца ўніз. Дзве гадзіны вісела на тэлефоне, пакуль прыехала служба МНС і зняла яго з даху. Быў выпадак, калі жыхарка дома трапіла ў бальніцу і тры дні не было ад яе ніякіх звестак. Родныя тэлефануюць Наталлі, просяць дапамагчы. Пачалі шукаць, аказалася, выпіла нейкай атруты і без прытомнасці трапіла ў бальніцу. Дзеці вельмі перапалохаліся, але цяпер з ёй усе добра.

Ёсць, вядома, сярод кантынгенту і прафесійныя скаржнікі. Адна такая жанчына так абгрунтавала сваю дзейнасць: мне сумна жыць. Але навошта псаваць жыццё іншым? — здзіўляецца Наталля. І прапанавала заняцца якой-небудзь карыснай справай.

— З другога боку, мне іх нават шкада. Затаілі калісьці злобу і мучаць сябе і іншых, замест таго каб адпусціць гэты смутак, — упэўнена жанчына. — Некаторым сапраўды трэба з кімсьці пагаварыць, данесці такую думку: крыкам і скаргамі справе не дапаможаш. Каб жыць прыгожа, трэба самім паклапаціцца...

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703
Продавец	Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», г. Слуцк, пл. Базарная, 13.

Предмет аукциона
Месторасположение – Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 117

№ лота	Наименование		Начальная цена лота с НДС
1	**Грузовой специальный автокран на базе ZIL-133-GYA, 1988 г. в., рег. номер АА3548-5**		**6 198,00 бел. руб.**
2	**Здание кирпичное д. 136А/1, инв. № 640/С-84557**	**40,4 кв. м.**	**36 416,00 бел. руб.**
	Здание склада д. 136А/2, 640/С-84559	**286 кв. м.**	

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении аукциона по лоту № 2 было опубликовано в газете «Звязда» от 31.05.2019 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Дата и время проведения аукциона: по лоту № 1 – 29.08.2019 г. в 11.30; по лоту № 2 – 09.08.2019 в 13.00. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.

Срок подачи документов: по лоту № 1 – по 27.08.2019 до 17.00; по лоту № 2 по 07.08 до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 07.08.2019 г. повторного открытого аукциона

Лот № 1: капитальное строение с инв. № 700/С-9525 – аккумуляторное отделение, площадь – 143,5 кв. м; расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000003007139 (площадь 0,1174 га, право постоянного пользования) по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 172/5. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание аккумуляторного отделения с асфальтобетонным покрытием.

Начальная цена продажи: 29 640,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 2 964,00 бел. руб.

Лот № 2: капитальное строение с инв. № 700/С – 9533 – мастерская зоны ТО-2, площадь – 1723,7 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000003007140 (право постоянного пользования, площадь 0,6825га), по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 172/6. Составные части и принадлежности: двухэтажное каменное здание мастерской зоны ТО-2 с асфальтобетонным покрытием. Капитальное строение с инв. № 700/С – 12467, площадь – 23,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000003007141 (право постоянного пользования, площадь 0,0974 га), по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 172/7. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание бензохранилища с асфальтобетонным покрытием, бетонным покрытием, покрытием из тротуарной плитки, двумя подпорными стенами, двумя резервуарами РГДП-25 (инв. №№ 100203, 100204).

Начальная цена продажи: 395 016,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 39 501,60 бел. руб.

Лот № 3: капитальное строение с инв. № 700/С-9526 – шиномонтажное отделение, площадь – 391,6 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000003007138 (право постоянного пользования, площадь 0,1969га) по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 172И. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание шиномонтажного отделения с асфальтобетонным покрытием. ***Начальная цена продажи: 93 240,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 9 324,00 бел. руб.***

Аукцион состоится 7 августа 2019 года в 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 06.08.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

Расчетный счет для перечисления задатка: получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Продавец: ОАО «Могилевоблавтотранс», УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1

Срок и условия оплаты: победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона, в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли – продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 12.03.2019, 15.05.2019, 16.05.2019, 02.07.2019

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Дополнительную информацию можно получить по тел.: **+ 375 222 72-41-14, + 375 29 624-26-25, на сайте ino.by**

Уважаемые акционеры ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»! 6 августа 2019 г. в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров с повесткой дня:

1. О выплате дивидендов.
2. Об утверждении локальных нормативных правовых актов.

Местонахождение ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»: г. Гомель, ул. Лещинская, 49.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Лещинская, 49.

Время регистрации в день проведения собрания с 10.30 до 11.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера дополнительно – доверенность).

Дата сбора реестра – 29.07.2019.

Справки по телефону: 8 (0232) 441017.

С материалами к собранию можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник – пятница) с 30.07.2019 (с 12.00 до 15.00) по месту нахождения общества.

Информация о формировании реестра владельцев ценных бумаг

Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс», находящееся по адресу: Республика Беларусь, г. Гомель, ул. Лещинская, 49, на основании решения наблюдательного совета от 23.07.2019 года для проведения внеочередного общего собрания акционеров определило дату сбора реестра акционеров – 29 июля 2019 года.

УНП 400078768

Ці ёсць будучыня ў дваровага парку?

Былы авіятар у адзіночку высадзіў дэндрарый у гарадскім мікрараёне

Уладзімір МОРАЎ — чалавек апантаны. У свае 82 гады амаль увесь дзень праводзіць на прыдамавой тэрыторыі, дзе яго намаганнямі створаны сапраўдны батанічны сад. Тут можна ўбачыць дрэвападобную півоню, воцатавае і каралавае дрэвы, хвойкі ў стылі «бансай», інжыр, авакада — усяго каля 200 розных відаў. Але паркавай зоне патрэбны належны дагляд, а магчыма, і новыя падыходы ў дызайне. Ці знойдуцца памочнікі ў гэтай справе, напрыклад той жа Камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, створаны пры мясцовым ЖЭСе?

Ад ваенных гарадкоў да жылога мікрараёна

Нельга сказаць, што пенсіянер не сябруе з камунальнымі службамі. Хутчэй, наадварот. Уладзімір Віктаравіч з цеплынёй успамінае былога кіраўніка УЖРЭП Кастрычніцкага раёна Гродна, з якім 20 гадоў таму «замуцілі» гэты праект. Напачатку прывялі ў парадак пад'езд, «ажывілі» яго карцінамі і кветкамі. З дапамогай ЖЭСа пафарбавалі драўляныя канструкцыі. Затым задумкі перакінуліся на свабодную прыдамавую тэрыторыю. Так у горадзе з'явіўся першы дэндрарый у жылым мікрараёне.

— У 90-х тут быў прыватны сектар, але яго пачаў выцясняць шматпавярховы мікрараён, а старыя дамы зносілі, — расказвае пенсіянер. — Калі мы сюды прыехалі, тут раслі некалькі яблынь і тры клёны. Да таго ж дамы ўзводзіліся каля самай загружанай магістралі, таму стаяла задача — абараніць сябе ад шкоднага ўздзеяння выхлапных газаў. Мы былі першыя ў горадзе, хто стварыў такі парк у жылым мікрараёне.

Удачы і правалы мясцовага дызайнера

Паралельна з азеляненнем стваралася немудрагелістая інфраструктура двара. Лаўкі, альтанка, дзіцячая пляцоўка...У дваровы пейзаж удала ўпісаліся тры валуны.

Перашкод на шляху стварэння зялёнай зоны аказалася нямала. То на адной інсталяцыі нешта зламана, то на другой. А тут яшчэ драўлянага мядзведзя пад'ядае нейкі жучок...

Пацікавілася, ці ёсць каманда аднадумцаў. Бо аднаму справіцца з такім аб'ёмам работы складана — трэба і прапалоць, і паліць, і падрамантаваць нешта. Як аказалася, час энтузіястаў застаўся ў мінулым. Многія з яго памочнікаў пераехалі, а тыя, хто прыйшоў, цікавасці да справы не праяўляюць. Раней дапамагалі і дзеці, збіраліся, палівалі са шланга, цяпер такіх няма.

— Паколькі гэта тэрыторыя ЖЭСа, ён сочыць таксама за парадкам, траву абкошваюць, УЖРЭП зрабіў два дзясяткі шпакоўняў, птушкі ўсе іх занялі, ёсць кармушкі і для сініц. Нядаўна амерыканскія клёны абрэзалі кардынальна. Напачатку жыхары абураліся, але я ім патлумачыў, што так дрэвы набудуць патрэбную форму, бо галіны навісалі, — расказаў Мораў. —Увогуле я ўдзячны нашым жыхарам, бо расходы на паліў кладуцца на ўсіх жыхароў пад'езда.

Крокі «зялёнага» асяроддзя

Пытаюся: па якім прынцыпе вялося азеляненне двара? Адказ такі: насычаць наваколле кіслародам і стварыць утульны куток. Таму высадзіў хвойкі і елкі. Яны тут ёсць паўсюдна. Нават у стылі «бансай». Але каб хвойка прыжылася, трэба яе правільна пасадзіць.

Некаторыя віды вырошчваў «з нуля». Напрыклад, грэцкі арэх.

— Я прыйшоў на рынак, бачу — мужчына прадае арэхі, прыехаў з Сярэдняй Азіі, — расказвае Мораў. — Я кажу: хачу тут вырасціць арэх. Выберыце мне такіх, каб яны абавязкова ўзышлі. Ён выбраў мне 15 штук і нават грошай не ўзяў, так яму гэта ідэя спадабалася. Ды яшчэ падзяліўся са мной сакрэтам. Бо ў іх вырошчванні ёсць свае асаблівасці. Садзіць трэба на зіму, каб былі марозаўстойлівыя. Амаль усе і прыжыліся з лёгкай рукі гандляра.

Экзатычныя саджанцы вырошчваюць проста ў кватэры. Жонка Уладзіміра Віктаравіча прывезла з Ізраіля насенне рэдкіх раслін, яны цяпер растуць у гаршках ля пад'езда. Адно каралавае дрэва Мораў аддаў у расійскае консульства ў Брэсце, другое — у гарадскую бальніцу, дзе яму знайшлі месца ў холе са шкляным купалам. Добра прыжыліся авакада, інжыр. Раскінулася магонія падубалістная з жоўтым суквеццем. Шыкоўнымі кветкамі радуе вока бругмансія. Ружы завяршылі першае квітненне і рыхтуюцца да другога. З'явіліся новыя парасткі ў дзявочага вінограда, які лічыцца дэкаратыўным.

Мораў няспынна расказвае пра кожную расліну. Успамінае, як паступова засаджвалі гэты куток. Напачатку звычайнымі бярозамі ды хвоямі, пазней пачалі прывозіць экзотыку. Добра прыжылося воцатавае дрэва. З Далёкага Усходу прывёз саджанец манчжурскага арэха.

Падыходзім да казацкага ядлоўцу, за якім будзе пасаджаны бэз. Пакуль яго няма, але для расліны адведзены цэлы куток. Далей растуць садовыя дрэвы — яблыні, вішні, слівы...

— Вось ціс, яго ягады чырвоныя і ядавітыя, — тлумачыць Мораў. — Ціс на Каўказе расце як дрэва, а ў нас больш як кустарнік. Ездзіў туды на адпачынак і прывёз саджанцы. У асноўным набываю пасадачны матэрыял за свае сродкі.

Праходзім па невялічкай бярозавай алеі. У глыбіні здаецца, што горад дзесьці далёка, а тут сапраўдны лясок, у якім спяваюць птушкі.

— Усяго гэтага магло і не быць, — кажа Уладзімір Віктаравіч. — Калісьці нам хацелі прыбудаваць да гэтага дома яшчэ некалькі пад'ездаў, але жыхары выступілі супраць і адстаялі, мы ездзілі на пасяджэнні гарсавета...

Ёсць і планы на найбліжэйшы час. Нядаўна па ўскрайку паркавай зоны праводзілі камунікацыі да прыпыначнага павільёна. Усё перакапалі, і ўтварылася пустка, якую трэба засадзіць кустамі, каб стварыць зялёны бар'ер аўтатранспарту. Частка тэрыторыі ўжо засаджана новымі дрэўцамі.

— Тут столькі людзей бывае! Калі да каго-небудзь прыязджаюць госці, абавязкова вядуць сюды, паказваюць, — расказвае Уладзімір Васілевіч. — Калі гэта пачыналася, такога двара ў Гродне ні ў кога не было, тут шэсць разоў праводзіліся мерапрыемствы ў маштабе Беларусі. Былі два віцэ-прэм'еры, двойчы — міністры ЖКГ, калі абмяркоўваліся азеляненні гарадоў. Тады тут было вельмі прыгожа, праходзілі семінары з удзелам камунальных службаў усіх абласцей, мы былі піянерамі, цяпер больш шырока распаўсюджана. Побач мужчына таксама высадзіў невялікі палісаднік, і далей ёсць.

Кожны дзень хапае работы, таму Уладзімір Васілевіч увесь час заняты справай. Ці хацеў бы ён супрацоўнічаць з камітэтам тэрытарыяльнага самакіравання? Хоць Мораў чуў пра іх, але ніякіх адносін з мясцовым органам не мае. Можа, таму, што любіць рабіць па-свойму, без падказак.

— У мяне была вельмі складаная і цяжкая служба. Хапіла надоўга, таму цяпер займаюся тым, што мне падабаецца, — рэзюмуе ён сваё захапленне.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Леанід АБРАЖЭВІЧ, намеснік дырэктара УЖРЭП Кастрычніцкага раёна г. Гродна:

— Уладзімір Мораў робіць добрую справу, ён сапраўды стварыў утульны куток прыроды ў гарадскім асяроддзі, які радуе ўсіх жыхароў. Але з часам многае прыходзіць у заняпад, тыя ж канструкцыі, мяккія цацкі выцвітаюць, яны не маюць таго выгляду, іх варта было б мінімізаваць. Па гэтым пытанні мы неаднойчы сутыкаліся са скаргамі жыхароў. Наогул гэтая зона патрабуе новых падыходаў і ў пасадках, больш прадуманага размяшчэння раслін. Спадзяюся, што ў апантанага дызайнера будуць добрыя памочнікі, магчыма, у выглядзе камітэта грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання.

Приорбанк RBI Group

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ИЮЛЯ 2019 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 1 июля 2019	На 1 января 2019
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		116 605	118 563
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103		391 195	341 219
5	Средства в банках	1104		564 122	720 934
6	Ценные бумаги	1105		439 187	259 362
7	Кредиты клиентам	1106		2 522 555	2 342 303
8	Производные финансовые активы	1107		281	45
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		26 923	22 354
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		179 173	183 364
11	Доходные вложения в материальные активы	1110		1 346	1 542
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111		990	4 974
13	Отложенные налоговые активы	1112		-	-
14	Прочие активы	1113		27 853	34 757
15	**ИТОГО активы**	**11**		**4 270 230**	**4 029 417**
15	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
16	Средства Национального банка	1201		-	-
17	Средства банков	1202		169 760	326 219
18	Средства клиентов	1203		3 256 266	2 953 172
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		100 438	67 398
20	Производные финансовые обязательства	1205		2	175
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
22	Прочие обязательства	1207		41 151	42 769
23	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**3 567 617**	**3 389 733**
24	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ				
25	Уставный фонд	1211		86 148	86 148
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		126 738	126 738
28	Фонды переоценки статей баланса	1214		88 742	90 049
29	Накопленная прибыль	1215		400 985	336 749
30	ВСЕГО собственный капитал	121		702 613	639 684
31	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**4 270 230**	**4 029 417**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ НА 1 ИЮЛЯ 2019 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 1 июля 2019	На 1 июля 2018
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		138 063	112 907
2	Процентные расходы	2012		39 798	25 809
3	Чистые процентные доходы	201		98 265	87 098
4	Комиссионные доходы	2021		93 227	82 062
5	Комиссионные расходы	2022		43 560	37 014
6	Чистые комиссионные доходы	202		49 667	45 048
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(1 424)	(768)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		29 241	20 773
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		(323)	5 818
11	Чистые отчисления в резервы	207		(6 480)	(26 327)
12	Прочие доходы	208		3 605	4 619
13	Операционные расходы	209		80 574	88 769
14	Прочие расходы	210		7 647	5 522
15	Прибыль до налогообложения	211		97 290	94 624
16	Расход по налогу на прибыль	212		22 053	24 682
17	**ПРИБЫЛЬ**	**2**		**75 237**	**69 942**

Временно и. о. Председателя Правления В.В. Дедюль

Главный бухгалтер В.В. Манцивода

Финансовая отчетность размещена на интернет-странице банка: **https://www.priorbank.by/kvartal-nye-otcety**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190

Закрытое акционерное общество «Смолевичи Молоко» (место нахождения: 222201, Минская обл., Смолевичский р-н., г. Смолевичи, ул. Социалистическая, д. 546) сообщает, что директором ЗАО «Смолевичи Молоко» 25.07.2019 г. принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг. Формирование реестра акционеров осуществляется по состоянию на 25.07.2019 г.

УНП 690668083

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 25 ліпеня 2019 года.